Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII. ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК 19 ВЕРАСЬНЯ 1932 № 208 (3587)

ТЭЛЕФОНЫ: Даказн. рэдактара 1-59; Даказн. сакратара 4-73; Сэктароў; Начальн. рэдактыр (два зв.) 12-55; Выдавецтва 2-14

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 месяц ... 1 руб.; 3 „ ... 3 „; 6 „ ... ; Падписка прымаецца ўключна на месяц і больш носьбі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ: 1 гракадковы 1 руб
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ: аб згубе 1 дакумэнту—2р.

Сеньня у нумары

Перадавы: Поўнасьцю выканаць фінплян III кварталу.

Артыкулы: В. Пятрушэня—Да чарговых пытаньняў у плянавай працы (3-я стар.).

Кожнай брыгадзе, калгасу, саўгасу—баявую апэрацыйную штодзённку (3-я стар.).

Пачынаюцца нармальныя заняткі ў партсэтцы (2-я стар.).

Здаровыя паравозы вырашаюць поспех выкананьня трансфінпляну (2-я стар.).

Па бальшавіцку завяршыць асеньні сеў і зябліве ворыва (2-я стар.).

Скончыць III квартал перамогай (1-я стар.).

Гадавы плян загатовак выкананы на 16,2 проц. (1-я стар.).

Поўнасьцю выканаць фінплян (1-я стар.).

Арганізаваць кругласутачныя работы на сіласаваньні (1-я стар.).

За граніцай.

Поўнасьцю выканаць фінплян III кварталу

Вялізарнейшыя задачы, пастаўленыя партыяй у чацьвёртым завяршаючым годзе першай пяцігодкі, патрабуюць од партыйных, фінансава-крэдытных і гаспадарчых арганізацый чоткай пастаноўкі работы, бальшавіцкай барацьбы зэ выкананьне фінпляну і стварэньня моцнай фінансавай базы, бо бяз «строгага выкананьня пляну цемагчыма ажыцьцяўленьне намечанага гаспадарчага пляну ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі». (З пост. аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Мы сязумоўна маем за апошнюю дэкаду зрух ў справе выкананьня фінпляну. На 10-га верасьня плян мабілізацыі сродкаў III кварталу выкананы на 70,1 проц. і 67,1 проц. па аграмадзяным сэктары. Апошняя дэкада дала 16,4 проц. прыросту. Рад перадавых раёнаў, дзе работа па мабілізацыі сродкаў была пастаўлена ў цэнтр штодзённай работы раённых партыйных, прафэсіянальных і камсамольскіх арганізацый, як адна з важнейшых гаспадарча-палітычных задач, мелі магчымасьць рапартаваць партыі і ўраду аб датэрміновым выкананьні квартальнага пляну (Заслаўскі, Мсьціслаўскі, Клімавіцкі, Сіроцінскі і Тураўскі раёны). Дзесяткі другіх перадавых раёнаў набліжаюцца да выкананьня квартальнага пляну (Лельчыцкі—95,1 проц., Чырвона-Слабодзкі—93,4 проц., Старобінскі—93,6 проц., Любаньскі—92,4 проц., Брагінскі—88,9 проц., Жыткавіцкі—87,4 проц. і рад інш.).

Але поруч з перадавымі мы маем рад раёнаў, якія ня здолелі па-бальшавіцку разгарнуць масавую работу па выкананьні фінпляну III кварталу, ня здолелі ўзьняць барацьбу за выкананьне пляну на ўзровень важнейшых гаспадарча-палітычных задач—гэтым самым ствараючы яўную пагрозу невыкананьня пляну мабілізацыі сродкаў III кварталу.

Толькі адсутнасьцю чоткага апэрацыйнага кіраўніцтва, ігнараваньнем дырэктыў партыі аб шырокім разгорт ваньні масавай работы, апартуністычным самацёкам на важнейшым вучастку фінансавага фронту тлумачыцца тое, што рад раёнаў цягнуцца ў хвасьце ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў (Веткаўскі раён—33,7 проц., Кармянскі—41,8 проц., Бягомльскі—42,4 проц., Лоеўскі—42,5 проц., Глускі—44,8 проц., Церахаўскі—46,1 проц. і рад інш.).

Буйнейшыя пралетарскія цэнтры, якія на працягу раду кварталаў паказвалі ўзор бальшавіцкай барацьбы за мабілізацыю сродкаў, выконваючы і перавыконваючы свае заданьні па фінпляне, у апошні час з-за адсутнасьці арганізацыйна-масавай работы, адсутнасьці бальшавіцкіх мэтадаў работы—спаборніцтва і ўдарніцтва, бязьдзейнасьці фінансавых арганізацый і райкамсоваў у III квартале здалі свае пазіцыі (Магілеў—58,8 проц., Бабруйск 51,9 проц., Гомель—67,5 проц., Віцебск—69,7 проц., Барысаў—59,7 проц.).

Толькі слабасьцю работы фінансава-крэдытных арганізацый тлумачыцца тое, што кантрольнае заданьне па падаходным падатку на 10 верасьня выканана на 80 проц., па страхоўцы—на 76 проц., па спажкаапэрацыі—на 68 проц. і 61 проц. рэалізацыі акцый Трактарцэнтру, і толькі ўсяго 17,7 проц. па ашчадкасе:

Фінансавы плян III кварталу ставіць выключна сур'ёзныя патрабаваньні да ўсёй фінансава-крэдытнай сыстэмы, партыйных, прафэсіянальных, камсамольскіх арганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці. III квартал зьяўляецца кварталам найбольш насычаным грашовымі сродкамі як па калгасным, так і па аднаасобным сэктары вёскі, бо ў гэтым квартале вялікія сродкі паступаюць у распараджэньне насельніцтва ад загатовак, сэзоннай работы, калгаснага гандлю сельскагаспадарчымі прадуктамі і іншых крыніц даходу. Гэтыя шырокія магчымасьці павінны быць улічаны фінансавымі арганізацыямі з тым, каб свая часова і цалкам выканаць плян мабілізацыі сродкаў па ўсіх сыстэмах.

Усё яшчэ нездавальняючыя вынікі рэалізацыі пазыкі,—67,2 проц. па калгасным сэктары і 4,9 проц. па аднаасобным—яўна зьніжаюць поспехі пазыковай кампаніі, затрымліваючы поўнае яе завяршэньне. Ва ўмовах інтэнсыўнага прыцёку грашовых сродкаў на вёсцы ў асеньня - зімовыя месяцы ёсьць усе падставы для поўнага ахопу пазыкай працоўных вёскі з тым, каб скончыць рэалізацыю пазыкі на вёсцы ў тэрмін, вызначаны ўрадам—25 верасьня.

Вялізарнае значэньне сярод сельскіх плацяжоў у III квартале набывае самаабкладаньне, сродкі ад якога ідуць на задавальненьне культурных і гаспадарчых патрэб вёскі. На працягу раду апошніх год самаабкладаньне, як форма актыўнага ўдзелу працоўных вёскі ў справе паскарэньня сацыяльна - культурнага будаўніцтва, заваявала моцнае месца. Ва ўмовах гіганцкай сацыялістычнай перабудовы вёскі, якая калектывізуецца, узрастаючыя шпаркімі тэмпамі патрабаваньні ў сацыяльна-культурным будаўніцтве на вёсцы пераганяюць гранічныя магчымасьці нашага бюджэту. Тут на дапамогу дзяржаве сваімі сродкамі, сваім актыўным удзелам у будаўніцтве новай калгасай вёскі прыходзяць калгаснікі і беднякі - сераднякі-аднаасобнікі. **На правільную арганізацыю і рэалізацыю самаабкладаньня павінна быць зьвернута асаблівая ўвага партыйных, і савецкіх арганізацый на вёсцы.**

Актывізацыю фінансавай работы на вёсцы неабходна спалучаць з усямерным узмацненьнем увагі да пытаньня рэвалюцыйнай законнасьці, з выкананьнем кожнага плацяжу ў поўнай адпаведнасьці са зьместам закону, адхіляючы ўсякія спробы, якія скажаюць генэральную лінію партыі ў яе фінансавай палітыцы на вёсцы.

Трэба самым уважлівым чынам падыйсьці да скаргаў працоўных вёскі на няправільныя дзеяньні фінорганаў і ў першую чаргу па абкладаньні сельска - гаспадарчым падаткам (а такія скаргі ад пераабкладаньні, аб не прадстаўленьні ільгот, або незаконным абкладаньні ёсьць у радзе раёнаў, у прыватнасьці ў агідным стане знаходзіцца справа з прадстаўленьнем ільгот чырвонаармейскім сем'ям і г. д.). Трэба спыняць усякія спробы да няправільнага выкарыстаньня атрыманых па самаабкладаньні сродкаў, насуперакі з пастановамі агульных сходаў паселішчаў, разгарнуўшы адначасова рашучую барацьбу супроць кулацкай агітацыі, якая бязумоўна будзе мець месца ў часе правядзеньня самаабкладаньня.

Вось за што ў мэтах забясьпечаньня пляну мабілізацыі сродкаў павінны біцца фінансавыя арганізацыі, сельсаветы, партыйна - камсамольскія ячэйкі на мясцох.

Фінансавыя арганізацыі адсталых раёнаў і пралетарскіх цэнтраў павінны зразумець тую вялічэзную адказнасьць, якую яны нясуць, **яны павінны зразумець, што сваёй бязьдзейнасьцю ў галіне выкананьня фінансавага пляну III кварталу яны зрываюць выкананьне фінансавага пляну рэспублікі ў цэлым і ставяць пад пагрозу выкананьне вялізарных плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, і адначасова ставяць пад пагрозу ўтрыманьне за БССР пераходнага чырвонага сьцягу Наркамфіну Саюзу і фінбанкаўскіх работнікаў.**

Толькі чоткай работай, правільнай расстаноўкай сіл, мабілізацыяй усёй масы працоўных на выкананьне вялічэзных задач, якія пастаўлены перад намі на даным этапе, здольнасьцю—па-бальшавіцку спалучаць усе гаспадарча - палітычныя кампаніі, правадзімыя зараз на вёсцы, з выкананьнем фінансавага пляну,—мы бязумоўна атрымаем перамогу на гэтым важнейшым вучастку фінансавага фронту, выканаем на 100 процантаў плян мабілізацыі сродкаў III кварталу.

Скончыць III квартал перамогай

Партыйныя арганізацыі Рагачэўшчыны і Ельшчыны слаба змагаюцца за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў

Скарыстаць застаўшыяся дні для поўнага выкананьня пляну III кварталу

Барысаўскі раён за апошні час не выходзіць з паласы ганебнага прарыву ў мабілізацыі сродкаў. На 10 верасьня квартальны плян выкананы на 59,7 проц., па аграмадзяным сэктары—61,5 проц. Яшчэ горш з асабістым страхаваньнем жыцьця. Тут кантрольнае заданьне выкананa ўсяго на 13,8 процантаў. Плян мабілізацыі сродкаў ашчадкасы за два мінулыя месяцы выкананы на 48,4 проц.

Ня лепшае стан робіцца і з рэалізацыяй пазыкі «4-га завяршаючага». Асабліва сярод аднаасобнага сэктару, дзе на 10-е верасьня рэалізавана пазыкі за наяўны разьлік ўсяго 10,3 проц. заданьня. Абвешчаная на аснове рашэньня ЦК КП(б)Б пазыковая эстафэта, яе гледзячы на пастанову РК КП(б)Б і райпрафсавету аб уключэньні ФЗМК і лізавых партыйных ячэек у эстафэту, засталася на паперы. Рашэньне РК КП(б)Б і райпрафсавету не даведзена да кожнай партыйнай ячэйкі ў паасобку. Рад сельсаветаў, калгасаў нават і прадпрыемстваў ня бедаюць аб пазыковай эстафэце. У выніку гэтага пазыковая эстафэта па горадзе, за выключэньнем камбінату «Камінтэрн» і лесазаводу імя Молатава не разгорнута.

Тысячы працоўных горада і вёскі засталіся неахоплены пазыкай. Не арганізавана дапамога з боку гарадзкіх шэфскіх арганізацый вёскі ў рэалізацыі пазыкі. Сельскія партыйныя ячэйкі і сельсаветы таксама ня ўключылася ў пазыковую эстафэту. У выніку чаго Барысаўскі раён у рэалізацыі пазыкі ганебна цягнецца ў хвасьце.

Райпрафсавет замест канкрэтнай дапамогі ў разгортваньні пазыковай эстафэты і мабілізацыі шырокіх мас працоўных на выкананьне заданьня па мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі абмяжоўваўся толькі тым, што за слабы ўдзел у пазыковай эстафэце распусьціў РМК фінонкаўскіх работнікаў. Адначасова з гэтым вынес суровую вымову старшыні саюзу хімікаарч тав. Скалубовічу і прэзыдыуму саюзу хімікаў фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» за неахоп падпіскай на пазыку 352 чалавека.

Адставаньне Барысаўшчыны—аднаго з прамысловых цэнтраў Савецкай Беларусі на далей ні ў якім разе недапушчальна. Тыя лічаныя дні, якія засталіся да канца кварталу, павінны быць скарыстаны для ўзмацненьня мабілізацыі шырокіх мас працоўных на адным з важнейшых вучастках фінансавага фронту з тым, каб Барысаўшчына з гонарам рапартавала партыі і ўраду аб стопроцантным выкананьні заданьня па мабілізацыі сродкаў III кварталу.

М.

У Рагачэўшчыне на дзесяткі тысяч рублёў не разданы аблігацыі пазыкі „3-га рашаючага"

РАГАЧЭЎ. (БЕЛТА). Праведзены Рагачэўскай РКК РСІ рэйд выявіў, што ў райашчадкасе да гэтага часу ляжыць нявыданых на рукі падпісчыкам і поўнасьцю аплачаных аблігацый пазыкі 3-га рашаючага» на суму 21850 руб. Кіраўніцтва ашчадкасы і ў прыватнасьці інспэктар тав. **Цырульнікаў** бездказна ад носяцца да выкананьня пастановы ўрадавых органаў аб саавчасовай раздачы на рукі падпісчыкам аплочаных аблігацый пазыкі. Акрамя гэтага ў райашчадкасе ляжыць яшчэ неаплочаных аблігацый пазыкі «3-га рашаючага» на суму 10658 руб.

У заўкоме Рагачэўскага райкамбіната ляжыць на 1100 руб. аплочаных аблігацый пазыкі «3-га рашаючага» і на ват на 360 руб. аблігацый пазыкі «5-ці годка ў чатыры гады». Аблігацыі яшчэ ня разданы рабочым. Камсод і заўком райкамбінату лічаць такое зьявішча нармальным і ніколькі ня імкнуцца раздаць аблігацыі па прызначэньні. На лесазаводзе імя Халтуры ня ляжыць нярозданых падпісчыкам на 5595 руб. аблігацый пазыкі «3-га рашаючага», **што складае 35 проц. сумы падпіскі на гэтую пазыку па заводзе.** Адміністрацыя лесазаводу і кіраўнікі заводзкай ашчадкасы тлумачаць залежваньне аблігацый тым, што «рабочыя ня ідуць па аблігацыі». Камсод лесазаводу бязьдзейнічае. На картоннай фабрыцы імя Сталіна не раздана аблігацый на 1555 руб. Старшыня камсоду Рагачэўскага пэдтэхнікуму **Гайшун** насіў у кішэні аблігацыі пазыкі «3-га рашаючага» (аплочаныя) на 2000 руб. датуль, пакуль ня згубіў іх. Студэнты, якія падпісаліся на пазыку, аблігацый не атрымалі.

Ёсьць факты прысвойваньня вылічаных па падпісцы на пазыку грошай паасобнымі адказнымі работнікамі. Былы загадчык Гарадзецкага маслазаводу **Гаўлін**, вылічаныя па падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы» грошы ад рабочых і служачых масла заводу прысвоіў сабе. Зараз ён пераехаў на працу ў м. **Ціхінічы**, а работнікі маслазаводу, выплаціўшы грошы за пазыкі, аблігацый атрымаць ніяк ня могуць.

Калгасьнікі калгасу **«Герой»** (Асаўніцкі сельсавет) ўнесьлі за пазыку «3-ці рашаючы» старшыні калгасу **Панцялееву** 595 руб. Панцялееў гэтыя грошы прысвоіў. Калгасьнікі гэтага калгасу аблігацый так і не атрымалі.

Паказаныя факты сьведчаць аб тым, што ў афармленьні пазыкі і раздачы аблігацый пазыкі падпісчыкам пануе бездказнасьць у лепшым выпадку, а то і проста злаўжываньні, накіраваныя на зрыў рэалізацыі пазыкі.

Пакласьці канец бязьдзейнасьці Ігрушацкага сельсавету

Плян мабілізацыі сродкаў III кварталу па Ігрушацкім сельсавеце, Крупскага раёну, амаль сарваны. На 25 жніўня не сабрана яшчэ нават трэцяе часткі сельгаспадатку.

Пазыка «4-ты завяршаючы» рэалізавана на 2 проц. Аднаасобны сэктар зусім выдаў з поля зроку сельсавету і партыйная ячэйка. Адсюль мы маем тое, што сярод аднаасобнага сэктару пазыка не рэалізавана ні на адзін рубель.

Гэтыя ганебныя паказьнікі ў выкананьні фінпляну III кварталу тлумачацца тым, што ў сельсавеце поўнасьцю адсутнічае масава-растлумачальная работа.

Бязьдзейнасьці сельсавету, партыйнай і камсамольскай ячэек патрэбна зараз-жа пакласьці канец. Слова за Крупскім РК КП(б)Б і РВК.

Селькор.

Паскорым на аснове самаабкладаньня сацыялістычную перабудову вёскі

ЕЛЬСК. 11-9. Па раёне шырока разгарнулася масавая работа па рэалізацыі пастаноў партыі і ўраду аб самаабкладаньні вясковага насельніцтва.

Па **Сачюкоўскім** і **Засінцоўскім** сельсаветах работа ўжо скончана. Амаль на ўсіх сходах прынята рашэньне аб самаабкладаньні на 130 проц. да сельгаспадатку. Агульны сход у Багуцішкім сельсавеце прыняў пастанову аб самаабкладаньні на 150 проц. да сельгаспадатку.

Пасьпяховае праведзеньне самаабкладаньня ў гэтых сельсаветах гаворыцца тым, што ўсе сродкі па самаабкладаньні ранейшых гадоў скарыстаны ў адпаведнасьці з пастановамі працоўных вёскі.

У вёсцы **Княжабор'е** (Сачюкоўскі сельсавет) за сродкі ад самаабкладаньня пабудаваны пажарны хлеў, закуплены пажарныя машыны і інш. У Багуцішкім сельсавеце за сродкі ад самаабкладаньня значна папышрана школьнае будаўніцтва, закуплены школьныя прылады і адрамантавана 6 школ.

Нездавальняюча праходзіць работа па самаабкладаньні ў Камсескім сельсавеце. У вёсцы Бярозаўцы на агульным сходзе, дзе стаяла пытаньне аб самаабкладаньні, высьветлілася, што гэтым сельсаветам на працягу двух год не скарыстоўваюцца сродкі ад самаабкладаньня. У вёсцы **Рудня** на працягу трох год будуецца школа, якая і на сёньняшні дзень ня скончана. Затрымка ў будаўніцтве гэтых аб'ектаў тлумачыцца тым, што старшыня сельсавету **Лемба** апартуністычна аднесься да гэтай важнейшай справы. Лемба тлумачыць несканчэньне пабудовы школы затрымкай у водпуску грошай раённымі арганізацыямі ў той час, як сродкі ад самаабкладаньня не скарыстаны.

Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі вёскі патрабуюць, каб сродкі ад самаабкладаньня поўнасьцю былі скарыстаны на тым мэты, якія былі выз начаны агульным сходам працоўных вёскі, з тым, каб паскорыць сацыялістычную перабудову, стаўшай на шлях калектывізацыі вёскі.

Герасіменка.

Арганізаваць кругласутачныя работы ПА СІЛАСАВАНЬНІ

Дзеньнік сіласаваньня кармоў

⊙ Дзяржынская МТС за апошнія дні разгарнула значную работу па сіласаваньні кармоў. Калі на 10 верасьня плян па сіласаваньні складаў 16,7 проц., дык на 15 верасьня ён даведзены да 31,4 проц. Усяго засілавана 2390 тон, а за апошнюю пяцідзёнку 1125 тон. Масавае сіласаваньне кармоў праводзіцца ў 48 калгасах. Зараз праводзіцца касьба бульбоўніку. На ўсіх вытворчых вучастках праведзены нарады па пытаньні сіласаваньня бульбоўніку ў калгасах. Вялікую актыўнасьць па сіласаваньні бульбоўніку праяўляе старшы аграном МТС тав. **Федарэнчык.**

⊙ ЖЛОБІН. (Ад наш. кар.). Мы ўжо нядаўна адзначалі, што ў Жлобінскім раёне сілос не ў пашане. Але сыгналы друку ня вывелі з халоднай раўнавагі жлобінскія зямельна-калгасныя арганізацыі. Сіласаваньне кармоў амаль не распачата. На 10 верасьня плян выкананы толькі на 6,6 проц. Да сіласаваньня кармоў прыступілі толькі 7 калгасаў («Расьсьвет Пераможца», «Новае Жыцьцё», «Чырвоны Жлобін», імя 12-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі», «Чырвоны Партызан», імя 11-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі», і імя Войкава. Паднаасобным сэктары сіласаваньне кармоў зусім не пачата.

Райза, райкалгасаюз і дырэкцыя МТС ня прымаюць ніякіх мер, каб па-бальшавіцку разгарнуць сіласаваньне кармоў. Райком ЛКСМБ таксама ні чога ня робіць. Райком КП(б)Б і РКК РСІ нічым не рэагуюць на поўную бязьдзейнасьць зямельна - калгасных арганізацый.

Закрэўскі.

⊙ ВУШАЧЫ. Рад сельсаветаў Вялікa-Далецкі, Кубліцкі, Чарноўскі, Завячэльскі, Вусаўскі, Гарадзецкі, Вацлаваўскі, Глыбачанскі і Жарскі) не прыступаюць да сіласаваньня кармоў. Плян сіласаваньня выкананы ўсяго 2 проц. Гэтыя сельсаветы апартуністычна недаацэньваюць мерапрыемствы па стварэньні моцнай кармовай базы. Між тым у мінулую зіму на гэтых сельсаветах жывёла галадала.

Кавецкі.

⊙ РАСОНЫ. Расонская МТС ня ўключылася ў верасьневуюкі сілосны паход. На 14 верасьня на калгасах МТС засілавана ўсяго 305 тон, што складае 5 пр. пляну (плян 6000 тон). Райком КП(б)Б павінен прымусіць дырэкцыю МТС па-сапраўднаму ўзяцца па сіласаваньне кармоў.

⊙ Бягомльская МТС паказвае ганебныя тэмпы работы ў справе сіласаваньня кармоў. Ня гледзячы на тое, што сілосныя культуры пачынаюць сохнуць, што ўвесь бульбоўнік можа загінуць, дырэкцыя МТС не разгарнула работы, з тым, каб усю зялёную масу закласьці ў ямы і траншэі. З пляну ў 5900 тон засілавана... 20 тон (0,3 проц. пляну). Да сіласаваньня кармоў прыступіў толькі адзін калгас «Чырвоны Сьцяг», Вітуніцкага сельсавету.

Замест спалучэньня, робяць стаўку на чарговасьць кампаній

УВАРАВІЧЫ. Месячнік штурму ў сіласаваньні кармоў мала цікавіць раённыя арганізацыі. Сілосныя культуры пачалі сохнуць, бульбоўніку пагражаюць прымаразкі, але да сіласаваньня кармоў на Уваравічыне ўпарта не прыступаюць. На 10-га верасьня засілавана ледзь 1430 тон зялёнай масы або 6,2 проц. Асабліва адстаюць калгасы раёну, якія выканалі плян на 4,5 проц.; зусім не прыступіў да сіласаваньня аднаасобны сэктар, ня гледзячы на тое, што яму вызначана засілаваць 5595 тон.

У чым корань прарыву? А справа ў тым, што зямельна - калгасныя, партыйныя і савецкія арганізацыі не зварочваюць належнай увагі на пытань не стварэньня моцнай кармовай базы. Раённая газэта «Калектывіст» не мабілізуе рабочых саўгасаў, калгасьнікаў беднякоў і серадняковаў аднаасобнікаў на выкананьне і перавыкананьне плянаў сіласаваньня. Вельмі часта на запытаньне — чаму не разгортваецца сіласаваньне кармоў? — вы можаце пачуць такі адказ: «скончым сяўбу, —тады прыступім да сіласаваньня». Гэта зьяўляецца правым апартуністам на практыцы, бо ствараецца ней кая чарговасьць работ. Да сіласаваньня-ж кармоў зьбіраюцца прыступаць тады, калі ня будзе ўжо чаго сіласаваць: калі трава пасохне, бульбоўнік памерзьне.

Уваравічына знаходзіцца ў палае глыбокага прарыву на вучастку стварэньня моцнай кармовай базы. Уваравіцкі раён, як жывёлагадоўчы, павінен быць забясьпечаны ў адпаведнай колькасьці сакавітымі кармамі ў выглядзе сілосу. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізаваць увагу ўсіх партыйных і камсамольскіх арганізацый і сельсаветаў на разгортваньне штурму па сіласаваньні кармоў. Трэба неадклад на прыступіць да сіласаваньня бульботнікаў, не пакінуўшы на полі ніводнага каліва травы ці зельля.

А. Казіміраў.

2-Й ДЗЕНЬ АГЛЯДУ НІЗАВОЙ КААПЭРАЦЫІ

ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ФІНПЛЯН

гэта значыць стварыць неабходныя прадпасылкі для яшчэ большага ўзмацненьня таваразвароту і самазагатовак

Раўняцца па ССТ Пухавіцкага раёну, якія перавыконваюць пляны мабілізацыі сродкаў

Выканаць узятае абавязацельства

Задача разгортваньня савецкага гандлю і ўзмацненьня таваразвароту бяз стварэньня ўласнай фінансавай базы спажкаапэрацыі пасьпяхова вырашана быць ня можа. Асноўнай крыніцай для ўзмацненьня фінансавай базы ССТ зьяўляецца мабілізацыя сродкаў: збор паявых узносаў, аванса ў і ўкладаў, мэтавых узносаў.

Квартальны плян мабілізацыі сродкаў на 10 верасьня па сыстэме сельскай спажкаапэрацыі выкананы на 66,4 проц. Рад раёнаў саапэрацыі па-бальшавіцку змагаюцца за стварэньне ўласнай фінансавай базы і дасягнулі ў гэтай барацьбе блюкучых вынікаў. **Лельчыцкі** раён, напрыклад, выканаў квартальны плян збору паявых узносаў на 140 проц., а мэтавых—на 135 проц., **Плешчаніцкі** раён выканаў плян паянакапленьня на 104 проц., **Сіроцінскі**—на 168 проц., **Вузьдзенскі**—на 125 проц.

Аднак, побач з гэтымі перадавымі раёнамі, значная частка раёнаў яшчэ вельмі адстае, што тлумачыцца выключнай бязьдзейнасьцю сыстэмы спажкаапэрацыі гэтых раёнаў. Да такіх раёнаў адносяцца: **Быхаўскі**, у якім спажкаапэрацыя выканала толькі 29 проц. квартальнага пляну збору паявых узносаў і 15 проц. збору мэтавых узносаў; **Веткаўскі**, дзе плян паянакапленьня выкананы на 31,7 проц., а мэтавых узносаў—на 10 проц. Значна адстаюць таксама **Клічаўскі** і **Рэчыцкі** раёны, дзе выкананьне пляну не перавышае 40 проц.

У часе правядзеньня агляду нізавой каапэрацыі гэтае адставаньне павінна быць поўнасьцю ліквідавана. Раўняючыся па прыкладах перадавых раёнаў адстаўшыя павінны так пабудаваць работу па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, каб на працягу месячніку агляду выйсьці з ганебных прарываў. Трэба памятаць, што спажсыстэма БССР у сваім адказе на заклік ленінградцаў вызначыла поўнае выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў, стварэньне моцнай фінансавай базы і ўпарта змагацца за ажыцьцяўленьне ўзятага абавязацельства.

Па-бальшавіцку змагаюцца за стварэньне фінансавай базы

Сыстэма спажкаапэрацыі Пухавіцкага раёну па-бальшавіцку змагаецца за ўзмацненьне фінансавай базы. Гэта работа праводзіцца пры шырокім удзеле пайнікаў. Плян паянакапленьня з кварталу ў квартал перавыконваецца. Так, плян II кварталу па зборы паявых узносаў выкананы на 101 проц., а два месяцы III кварталу далі 83,5 проц. выкананьня квартальнага пляну. Яшчэ больш пасьпяхова выконваецца плян збору аванса ў і ўкладаў. Калі ў I квартале плян быў выкананы на 159,1 проц., дык II квартал даў 355 проц., а два месяцы III кварталу—241 проц. Параўнаўча адстае выкананьне пляну мэтавых узносаў, але і тут пляны выконваюцца.

Усе ССТ маюць у банку асабістыя рахункі, што яшчэ больш стымулюе іх работу па ўмацаваньні фінансавай базы і разгортваньні таваразвароту.

Наяўнасьць моцнай фінансавай базы дала магчымасьць ССТ Пухаўшчыны шырока разгарнуць пазапляновыя загатоўкі і за кошт іх перавыконваць пляны таваразвароту. Напрыклад, квартальны плян таваразвароту на раёне за два месяцы выкананы на 101,7 проц.

Вопыт барацьбы за ўзмацненьне фінансавай базы ССТ Пухавіцкага раёну павінны перанесьці на ўсе галіны сваёй работы

БУРДЫКА.

ССТ Пухавіцкага раёну

Барздынскае ССТ, Заслаўскага раёну

Не падмяняць масавай работы

Барздынскае ССТ за апошнія месяцы адбілася значных зрухаў у сваёй рабоце. Пасьпяхова разгортваецца таваразварот, ліквідаваны залежы тавараў на складах. Практыкуецца разнавозны гандаль: за час уборачнай кампаніі крамамі зроблена 8 выездаў з таварамі ў калгасы. Перавыкананы плян асобных відаў загатовак. Напрыклад, плян загатовак яек выкананы на 114 пр. Дасягнуты зрух у ліквідацыі дэбіторскай запазычанасьці, якая амаль зусім спагнана яшчэ ў чэрвені.

Але недахопаў усё-ж такі яшчэ многа і да ліквідацыі іх ССТ захадзіў ня прыняе. Пазапляновыя закупкі і загатоўкі не разгорнуты, не арганізаваны выгаб тавараў шырспажыву, хоць да гэтага і ёсьць магчымасьці. У крамах няма прэйскурантаў цэн, прыцыпы выбарчасьці ў ССТ парушаны. Прыўленьне амаль зусім ня ўцягнута ў работу, крамныя камісіі не працуюць.

Наглядаюцца скажэньні ў выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў. Напрыклад, калі ў крамы паступіў лукар, прызначаны для разьмеркаваньня сярод пайнікаў яго, пачалі выдаваць толькі тым пайнікам, якія ўнясуць аванс ня менш 10 руб. Толькі такім шляхам ССТ меркавала выканаць плян збору аванса ў, падмяняючы масавую растлумачальную работу голым адміністраваньнем. Сыстэматычнай работы па збору паявых узносаў таксама не вядзецца і паявыя ўзносы зьбіраюцца талоўным чынам пры паступленьні ў крамы тавараў першай неабходнасьці.

Такія «мэтады» работы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў Барздынскае ССТ павінна рашуча ажыць з сваёй практыкі.

Сарокін.

Жыцінскае ССТ, Стара-Ларoскага раёну

Мэтадамі адміністраваньня

Жыцінскае ССТ у выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў мае глыбокія прарывы. Асабліва адстае выкананьне пляну паянакапленьня, які за ліпень аказаўся выкананым толькі на 5 проц. Належнага зруху ў гэтай рабоце ня было і ў жніўні.

Лічба ў 5 проц. досыць яскрава характэрызуе становішча работы ССТ па мабілізацыі сродкаў. І нічога дзіўнага. Калі прыглядзіцца да мэтадаў работы ССТ па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, дык наадварот было-б дзіўным калі-б плян аказаўся выкананым. Сыстэматычнай барацьбы за плян мабілізацыі сродкаў ССТ не вядзе, каапактыў да гэтай справы не прыцягваецца.

Паявыя ўзносы зьбіраюцца «ад выпадку да выпадку». Прывязуць у краму тавары, у якім пайнікі адчуваюць вострую патрэбу, тады і пачынаецца «выкананьне» пляну мабілізацыі сродкаў—у пайнікаў праваяецца зьпрата ажыцьцяўленьня

Па бальшавіцку завяршым асенні сеў і зяблівае ворыва

Ход сяўбы азімых па БССР, як бачым з падпанай зводкі, яўна незадавальняючы. Апошняя пяцідзёнка павінна была быць ў асноўным рашаючай у завяршэньні выканаўня пляну. Між тым параўнальна з папярэдняй пяцідзёнкай ёсьць прырост толькі на 17,9 проц. (на 10-IX было 44,2 проц.).

Па-ранейшаму цягнуцца ў хвасьце Нараўлянскі раён, які выканаў плян на 9,5 проц., Уваравіцкі—18,3 проц., Дрысенскі—23 проц., Бягомльскі—38,4 проц., Жлобінскі—24 проц., Жыткавіцкі—26,3 проц., Лоеньскі—42,8 проц.

У шэраліччаных раёнах барацьба за ўраджайнасьць азімых пра дастаўлона самацёку. Ніжі процант выканаўня пляну ставіць перад раённымі арганізацыямі галавую задачу—неадкладна павярнуцца тварам да сяўбы, дабіцца рашучага пералому.

Усялякія «месьніцкія» матывы аб зацяжцы сяўбы адстаючых раёнаў павінны разглядацца як праява апартунізму. Уся справа ў здольнасьці, ўменьні па-бальшавіцку арганізаваць барацьбу за ўраджай. Гэтая ісьціна даведзена на вопыце перадавых раёнаў.

Па-ўдарнаму змагаецца за раньнюю сяўбу азімых Гарадоцкі раён, які выканаў плян на 88,3 проц., Аршанскі—83,2 проц., Чавускі—86,6 проц., Сураскі—81,3 проц., Бабруйскі—81,1 проц., Шкловскі—80,8 проц., Бялыніцкі—79,8 проц., Мсьціслаўскі—79,1 проц. Следам за імі ідуць—Быхаўскі, Чырвона-Слабодзкі, Клічаўскі, Клімавіцкі, Менскі, Горацкі, Кармянскі і Барысаўскі раёны.

Разам з гэтым трэба адзначыць недапушчальнае паслабленьне барацьбы за раньняе зяблева. Калі сяўба азімых параўнальна з мінулым годам ідзе наперадзе, дык гэтага нельга сказаць пра зяблівае ворыва. На 15 верасьня 1931 году плян зяблева быў выкананы на 6,8 проц. супроць 5,4 проц. гэтага году.

Барацьба за 1.360.000 га азімых і 1.500.000 га зяблева пастаўлена як адна з баявых задач. Бягучая пяцідзёнка павінна стаць рашаючай у завяршэньні сяўбы азімых, рашаючым пераломам ў выкананьні пляну зяблівага ворыва.

Мабілізуючы калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на завяршэньне сяўбы, партарганізацыі і саветы адначасова павінны дабіцца таго, каб да 20 кастрычніка ўзараць пад зяб прадугледжаныя плянам 1.500.000 га.

Аб ходзе сяўбы азімых і зяблівага ворыва па БССР

	Азімыя ў (проц.).	Зяблева (у проц.).
Зык. на 15-IX 1932 г.	62,1	5,4
Было на 15-IX 1931 г.	52,5	6,8

Пераможцы сяўбы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Па раёне разгарнулася масавая сяўба азімых. Перадавыя калгасы, якія ўмела спалучылі ўборачную кампанію з падрыхтоўкай да сяўбы, своячасова скончылі засеў азімых культур.

Калгас «Чырвоны партызан» Дабрасьневіцкага сельсавету, які неадпара зова ўзяваў добрыя прыклады ў выкананні гаспадарча - палітычных кампаній—у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у час сяўбы і ўборкі гэтыя посьпехі памножыў, поўнасьцю скончыўшы сяўбу на плошчы 67 га, што складае 125 проц. пасеўнага пляну.

Гэтыя посьпехі калгасу забясьпечаны правільнай расстаноўкай сіл на аснове зьдзелышчыны, штодзённым кіраўніцтвам партячэйкі, МТС і сельсавету, разгортваньнем сацпаборніцтва і ўдарництва.

5 верасьня ў баявой гатоўнасьці калгас прыступіў да ўборкі бульбы.

Узятыя тэмпы ў час вясеньняй сяўбы і ўборачнай замацавалі калгасы «13-годзьдзе Чырвонай арміі» і імя Сталіна, Цішоўскага сельсавету. Заключыўшы паміж сабой сацдагавор на датэрміновае скончэньне сяўбы, пункты гэтага сацдагавору яны з гонарам выканалі—4 верасьня сяўба на абодвых калгасах скончана. Калгас «13-годзьдзе Чырвонай арміі» перавыканаў плян сяўбы на 2 га, калгас імя Сталіна выканаў плян на 100 проц.

Ударныя тэмпы сяўбы паказвае калгас імя Карла Маркса, Дабрасьневіцкага сельсавету. Шырокая папулярызацыя пастаноў аб сяўбе, а таксама аб захаваньні калгаснай маемасьці праведзеная сакратаром ячэйкі т. Якаўлевым і старшынёй сельсавету т. Плюскевічам узьняла актыўнасьць калгасьнікаў на ўдарнае правядзеньне сяўбы. Сяўба ў калгасах распачата 3 верасьня і на сёньня засеяна 49 га, што складзе 90 проц. пляну. Дзякуючы шырока-разгорнутай масавай рабоце, калгасьнікамі высунут сустрэчны плян у 13 га.

Вялікая ўвага зьвернута на якасьць сяўбы. Засеў утвараецца ачышчаным насеньнем, добра апрацаванай глебай, а гэта гарантуе высокі ўраджай.

УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ УБОРКІ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ

Прафсаюзы павінны выканаць свой абавязак перад пралетарскай грамадзкасьцю

Весткі аб ходзе ўборкі культур па прыгарадных гаспадарках сыстэмы БКС сьведчаць аб пагражаючым становішчы пасьпяховага завяршэньня ўборкі. На палёх і гародах прыгарадных гаспадарак яшчэ засталася вялікая колькасьць няўбраных культур. Асабліва дрэнна ў абстаіць справа з уборкай кораньплодаў (0,6 проц.), гародніны і раньняй бульбы (15,7 проц.), што яўна пагражае забясьпечаньню пралетарскіх цэнтраў.

19 прыгарадных гаспадарак, у тым ліку буйнейшыя гаспадаркі ЗРК—«Вэзэві» (Гомель), «Герой працы» (Добруш), «Новы шлях» (Магілеў)—яшчэ зусім не прыступілі да ўборкі гародніны і раньняй бульбы.

Што-ж прывяло прыгарадныя гаспадаркі да такога глыбокага прарыву?

На гэта пытаньне ня цяжка адказаць. Асноўны недахоп на ўборцы—гэта адсутнасьць належнай колькасьці рабочай сілы і недахоп тары для перавозкі ўбраных культур (гародніны, кораньплодаў, раньняй бульбы). Абяцанне ЦСПСЬ мабілізаваць на ўборку ў прыгарадныя гаспадаркі 1000 чалавек, так і засталіся абяцанкамі. Большасьць прыгарадных гаспадарак гэтых людзей і ня бачылі. Досыць ладаць такі факт, калі ў Менскія гаспадаркі трэба было мабілізаваць 300 чалавек, а працавала толькі 180. У іншых гарадох і гэтага ня было (Гомель, Магілеў, Мазыр).

Недахоп тары ў сваю чаргу зьнізіў тэмпы ўборкі, бо ўбраную гародніну і бульбу нельга пакідаць у гаспадарцы, а трэба неадкладна накіраваць у горад. Гэта адбілася на завозе гародніны і бульбы ў пралетарскія цэнтры БССР. Так, плян III кварталу завозу гародніны ў Гомель на 15-га верасьня выкананы ўсяго на 39,2 проц., па бульбе на 16,5, у Віцебск плян завозу гародніны выкананы на 43,1 проц., па бульбе на 26,4 проц.

Тут трэба дабіцца неадкладнага пералому. Прафсаюзы павінны зараз-жа выканаць узятае на сябе абавязацельства і мабілізаваць членаў прафсаюзу ў прыгарадныя гаспадаркі на дапамогу па ўборцы.

Нельга дапусьціць таго, каб хоць адзін гектар застаўся няўбраным, каб хоць адно кілё гародніны, бульбы, кораньплодаў засталіся на полі. Мы патрабуем неадкладнага ўстаўленьня рабочага кантролю над ходам уборкі ў прыгарадных гаспадарках, поўнага за бясьпечаньня ўбранай гародніны тарай.

Убрана па прыгарадных гаспадарках сыстэмы БКС

(у проц. па культурах)

На 10 верасьня

Зярнёвыя	78,6
Сілосныя	50,8
Кораньплоды	0,6
Іншыя збожжавыя	5,5
Гародніна (у тым ліку раньняй бульбы)	15,7

Пра ўвядзеньне разавага збору для ўтрыманьня рынкаў у чыстаце і пакрыцьця выдаткаў па ўборцы рынкаў

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 20 мая 1932 г. «Пра парадак правядзеньня гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобных сялян і зьмяшэньне падатку на гандаль сельскагаспадарчымі прадуктамі» (З. З. СССР 1932 г., № 38, арт. 233) Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет народных камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і саветам скасаваць усе існуючыя мясцовыя падаткі і зборы з гандлю калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян прадуктамі сельскагаспадарчай вытворчасьці на рынках, пляцох, чыгуначных станцыях, прыстанях (хлеб, мяса, птушкі, яйца, малочныя прадукты, гародніна і г. д.),

2. Для ўтрыманьня рынкаў у чыстаце і пакрыцьця выдаткаў па ўборцы рынкаў дазволіць гарадскім саветам і раённым выканаўчым камітэтам увесьці ў гарадох, рабочых пасёлках і сельскіх мясцовасьцях разавы збор, прычым гэты збор не павінен перавышаць за дзень гандлю: з воза—1 р., пры гандлі з рук, на латках і г. д.—20 кап., са штукі буйнай жывёлы (быкі, валы, кароўы, коні)—1 руб. і са штукі дробнай жывёлы (авечкі, козы, цяляты, сьвіньні)—50 кап.

3. Забараніць спагнаньне разавага збору з гандлю з рук птушкамі, яйкамі, малаком, маслам, сырам, які праводзяць калгасьнікамі і аднаасобнымі працоўнымі сялянамі.

4. Разавы збор спагнаецца збаршчыкамі, гарадзкіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, якія павінны выдаваць квіткі па ўстаноўленай форме.

5. Сумы разавага збору паступаюць у мясцовы бюджэт і павінны скарыстоўвацца толькі на ўтрыманьне рынкаў у чыстаце і на пакрыцьцё выдаткаў па ўборцы рынкаў.

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

М. Гілякевіч

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

М. Ляўкоў.

ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТПРОПНАРАДЫ ПРЫ ЦК КП(б)Б

Пачынаюцца нармальныя заняткі ў партсетцы

Задача ячэек, калектываў, райкомаў—ужо з самага пачатку навучальнага году штодзенна кіраваць і канкрэтна дапамагаць рабоце партшкол

1-га кастрычніка павінен пачацца навучальны год па ўсёй сетцы партыйнай асьветы. Перадавыя арганізацыі да навучальнага году падрыхтаваны цалкам. На заводзе «Бальшавік» ужо 23-га верасьня пачынаюцца нармальныя заняткі ў партшколах. Але далёка не ва ўсіх ячэйках і калектывах так добра. Аб гэтым яскрава сьведчаць матар'ялы з Мсьціслаўлю.

20-га верасьня адкрываецца ўсебеларуская культпропнарада пры ЦК КП(б)Б. На нарадзе разам з іншымі пытаньнямі будзе аб гаворана пытаньне аб асеньня-зімовай партвучобе і будуць вызначаны канкрэтныя шляхі работы сеткі партасьветы ў асеньня-зімовым пэрыядзе.

Да адкрыцьця культпропнарады ўвесь цэнтральны друк прызначае пачатак усебеларускага рэйду праверкі падрыхтаванасьці партыйных арганізацый да зімовай партасьветы і становішча вучобы зараз. Рэйд павінен выявіць як праведзена камплектаваньне, як падрыхтаваны прапагандысты, ідэёва палітычны зьмест вучобы, становішча завочнага навучаньня, як партарганізацыі кіруюць марксыцка-ленінскім выхаваньнем і як пізавы друк змагаецца за марксыцка-ленінскае выхаваньне

Задача ўсіх партыйных ячэек, усіх рабкораў, селькораў, партыйнай і ўсёй працоўнай грамадзкасьці ўключыцца ў рэйд, дапамагчы нашым брыгадам добра правесьці яго. Рэйд пачынаецца 20-га верасьня і будзе працягвацца да 1-га кастрычніка—масавага пачатку асеньня-зімовай партвучобы.

І ў гэтым годзе быць узорнай

Партарганізацыя чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» добра ўразумела значэньне партыйнай асьветы і таму па-бальшавіцку рыхтуецца да зімовай партвучобы.

Правёўшы папярэдне падрыхтоўчую работу, бюро парткалектыву абвясьціла з 1-га па 10 верасьня дэкадзнік за марксыцка-ленінскае выхаваньне. У часе дэкадніка была разгорнута вялікая масава-растлумачальная работа. Пасьля адпаведнага абгаварэньня задач дэкадніка на бюро цэхавых ячэек праца была перанесена непасрэдна ў партгрупы брыгад. Была праведзена агульна-заводзкая нарада лізавых трохкутнікаў, пасьля якой былі скліканы спэцыяльныя сходы партгруп з удзелам усіх рабочых.

Дэкадзнік праводзіўся пад знакам сацпаборніцтва: адна партгрупа выклікала другую на лепшы абход вучобай, на 100 процантнае наведваньне, замацаваньне ў школах да канца вучэбнага году. Партгрупа Лашчэня, першага хромавага цэху, выклікала групу набіўкі. Партгрупа сушкі, жэлацінавага цэху—партгрупу варшчыкаў, таго-ж цэху. Праведзен рад гутарак у часе абедзеных перапынкаў аб задачах партасьветы. Цэхі ўбраны адпаведнымі мабілізуючымі лёзунгамі, плякатамі, паўсюды вывешаны абвявы з пералікам арганізованых на заводзе школ.

Праведзеная масавая работа 1 атэрацыйнае кіраўніцтва дэкадзнікам з боку бюро калектыву дала добрыя вынікі. 7 верасьня на перадні ны, бульбы, кораньплодаў засталіся на полі. Мы патрабуем неадкладнага ўстаўленьня рабочага кантролю над ходам уборкі ў прыгарадных гаспадарках, поўнага за бясьпечаньня ўбранай гародніны тарай.

мольцы ахоплены пакуль яшчэ толькі на 85 проц. Брыгада лашчыльшчыкаў першага хромага цэху ўцягнула ў партшколы 100 проц. свайго складу. Таксама і брыгада шыропажыву і цэлы-рад іншых брыгад.

Пасьля партдню работа разгарнулася яшчэ шырэй. Партарганізацыя «Бальшавіка» набліжаецца да поўнага выкананьня дырэктывы аб ахопе вучобай 100 проц. партыйцаў і ня менш 40 проц. беспартыйных рабочых.

Такое пасьпяховае камплектаваньне тлумачыцца яшчэ і тым, што сетка партшкол добра пабудавана. Сеткай прадугледжана арганізацыя раду школ з разьлікам на ахоп усіх груп актыву асобных прафэсій: школа партактыву, курсы цэхавога партпрафактыву, гурток качагараў, школа намазчыкаў (кандыдацкая), і г. д. Гэта акрамя партшкол нармальнага тыпу. Трохмесячныя і шасьцімесячныя школы арганізуюцца непасрэдна пры цэхпартячэйках, на якія ўскладзена адказнасьць за іх.

За лета падрыхтавана пяць рабочых прапагандыстаў. Школы забясьпечаны памяшканьнем, апаламі і асьвятленьнем. Мяркуецца 23 верасьня пачаць нармальныя заняткі.

Галоўнай задачай партарганізацыі заводу «Бальшавік» зараз зьяўляецца барацьба за высокую якасьць работы, за замацаваньне ў школах да канца году ўсіх запісаўшыхся, за ўвязку тэарэтычных праграм з практыкаю вытворчага жыцьця заводу, за вучэбную дысцыпліну. Партарганізацыя чырвонасьцяжнага «Бальшавіка», якая ў мінулым годзе лепш іншых у Менску паставіла справу ўзбраеньня марксыцка-ленінскімі ведамі, павінна і ў гэтым навучальным годзе быць узорнай.

Норкін.

Паставіць партыйную вучобу ў асяродак увагі ўсёй партыйнай арганізацыі

МСЬЦІСЛАЎ. (Наш кар.). Распачынаюцца зімовыя заняткі ў школах партыйнай асьветы. Зусім зразумела, што якасьць работы школ будзе амаль цалкам залежаць ад ступелі падрыхтаванасьці партыйных арганізацый да пачатку новага навучальнага году. Неабходна зараз дакладна ўлічыць усе памылкі, дапушчаныя ў мінулым годзе і ў часе летняй вучобы з тым, каб на ходу выправіць слабыя месцы, падыйсьці да пачатку навучаньня ў школах партыйнай асьветы ў поўнай падрыхтаванасьці.

Перш, чымся гаварыць аб становішчы падрыхтоўкі да навучальнага году па Мсьціслаўскай партарганізацыі, неабходна застанавіцца на тым, якія вынікі ёсьць ад летняй вучобы. Зось калі пачаць падлічваць гэтыя вынікі, дык трэба проста сказаць, што яны вельмі сумныя.

Усім вядомы адпаведныя жорсткія ўказаньні аб неабходнасьці разгортваньня сыстэмы навучаньня ўлетку. Але-ж па Мсьціслаўскім раёне гэтыя ўказаньні засталіся невыкананымі. Паводле пляну меркавалася мець пры кожнай партячэйцы гурток бягучай палітыкі. На справе-ж толькі ў двух ячэйках такія гурткі існавалі, а ўсё астатнія ячэйкі прапрацоўку ўсіх асноўных пытаньняў (рашэньні пленуму ЦК і ЦКК і г. д.) праводзілі выключна на агульных сходах, разам з сялянствам і не праводзячы ніякай работы ў гурткох.

Мэтадычнага кіраўніцтва ячэйкам не аказвалася. Агітпропгабінэт ўвесну закрыўся, ды так ўсё лета і не адкрываўся. Члены мэтадбюро разьехаліся — хто ў водпуск, а хто яшчэ куды і ўвесь час не працавалі.

Вось надзвычайна сьціслы малюнак становішча партыйнай вучобы ў летні час.

Аб чым гэта гаворыць? Гаворыць аб тым, што з боку партыйных ячэек і культпропа райкома КП(б)Б ня было зьвернута дастатковай увагі на партыйную вучобу, што гэтая справа была пакінута без штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва, што прывяло да фактычнага зрыву летняй вучобы.

Зараз пры надыходзе зімовай вучобы гэтыя памылкі павінны быць выпраўлены. Раён зараз узмоцнена рыхтуецца да сустрэчы новага навучальнага году. Складзена сетка партыйных школ. Усе кандыдацкія школы забясьпечаны адпаведнымі прапагандыстамі. Але сярэдняя група школ прапагандыстаў яшчэ ня мае. Для падрыхтоўкі прапагандыстаў толькі з 20 верасьня арганізуюцца раённыя курсы на 2 месяцы. Такім чынам значная частка школ пачне нармальны заняткі толькі ў канцы лістапада.

Па раёне праведзены спэцыяльныя куставыя сходы партыйных ячэек, на якіх (сходах) абтаворваны даклады аб зімовай партыйнай вучобе. У прыватных пастановах вялікая ўвага ўдзяляецца пытаньню абхопу партыйнай вучобай усіх камуністаў, якасьці вучобы і выкладаньня. Ад слухачоў і прапагандыстаў патрабуецца максымальнае напружаньне ўсіх сіл на ўсямернае палепшаньне якасьці выкладаньня, а таксама і ўсвяваньнасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна знайсьці ў рабоце школ самы шырокі ўжытак, зьявіцца асноўным мэтадам работы.

Асобна неабходна застанавіцца на вучобе партыйнага актыву.

У мінулым годзе вучоба партыйнага актыву праходзіла з вялікімі перабоямі. У раённым цэнтры існаваў дэкадны камвуз. Але работу праводзіў ён надзвычайні нікуды ня варта. Бюро райкому вымушана было вынесьці на пленум райкому пытаньне аб зрыве партыйнай вучобы. Пядзярым найбольш злосным зрыўшчыкам вучобы былі даны суровыя вымовы. Але-ж і гэтакія выключныя меры не аказалі неабходнага ўзьдзейнічаньня і заняткі камвузу, які і наперад, ішлі з перабоямі.

Вясковы актыў больш працуе над сабой, больш чытае, чаго нельга сказаць аб пераважнай большасьці раённых працаўнікоў. За летні час з раённым актывам амаль ніякай вучобы не праводзілася. Значная частка раённых працаўнікоў у тэарэтычнай падрыхтоўцы кульгае на абедзьве нагі. На запытаньне аб тым, ці чытаеш газэту?—звычайна атрымліваеш адказ: чытаць ня маю часу, пераглядаю, што патрэбна. Гэта зазначыць, што значная частка раённых працаўнікоў нават і газэт ня чытае. Асноўны партыйны кіруючы часопіс «Бальшавік» выпісваецца ў надзвычай абмежаванай колькасьці. У выніку гэтага быў такі выпадак: загадны канторы «Загатзерне» тав. Іваноў быў у якасьці ўпаўнаважанага РК КП(б)Б накіраваны ў адну з вясковых ячэек для дапамогі ёй у правядзеньні выбараў на раённую партканфэрэнцыю. Іваноў, ня ведаючы сам статуту партыі, зблытаў ячэйку і дэлегатамі на партканфэрэнцыю былі абраны кандыдаты партыі.

Якія-ж вывады неабходна зрабіць. Вывады напрошваюцца самі сабой. Мсьціслаўскай партыйнай арганізацыі неабходна зараз-жа ўжыць самыя рашучыя захады, каб вызначаныя меры прымествы па разгортваньні зімовага партыйнага навучаньня поўнасьцю выканаць. Неабходна дабіцца таго, каб сёлета ня было ніякіх зрываў правалаў у рабоце партыйных школ. Для гэтага павінна быць разгорнута адпаведная растлумачальная работа. Неабходна усур'ёз, з усёй катэгарычнасьцю, паставіць перад партыйным актывам пытаньне аб паглыбленай рабоце над узвышэньнем свайго тэарэтычнага ўзроўню, ужываючы для зрыўшчыкаў вучобы самыя рашучыя меры партыйнага ўзьдзеяньня.

Партыйная арганізацыя павінна сесьці за вучобу. Правал улетку не павінен быць паўторан узімку

Г.

Асеньня-зімовыя перавозкі—на ўдарныя рэйкі

ЗДАРОВЫЯ ПАРАВОЗЫ ВЫРАШАЮЦЬ ПОСЬПЕХ ВЫКАНАНЬНЯ ТРАНСФІНПЛЯНУ

Па-бальшавіцку падрыхтавацца да 3 конкурсу спараных брыгад

Асеньня-зімовыя перавозкі патрабуюць поўнай падрыхтоўкі і мабілізацыі ўсіх зьвеньняў транспарту. Але-ж гэтага яшчэ не ўсьвядомілі многія чыгуначныя арганізацыі цэлага раду важнейшых чыгуначных вузлоў і станцый БССР.

Ня гледзячы на тое, што партыя і ўрад давалі неадназоўную і зусім яскравую дырэктыву чыгуначным арганізацыям аб своячасовай падрыхтоўцы ўсіх зьвеньняў транспарту да асеньня-зімовых перавозак, на сёньняшні дзень трэба канстатаваць той факт, што належнай, сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі на вузлах і станцыях яшчэ не адчуваецца.

Перавозкі фактычна ўжо пачаліся. На чыгунцы ўжо пайшлі розныя грузы: збожжа, плодагародніна, будматар'ялы ды інш. Але-ж тое становішча, якое мы на сёньняшні дзень маем на транспарце, не дае ўпэўненасьці ў тым, што транспарт з тымі вялікімі задачамі, якія перад ім стаяць у апошнім заключным годзе першай пяцігодкі, цалкам справіцца.

Дрэнную падрыхтоўку многіх зьвеньняў транспарту нельга нічым іншым тлумачыць, як тым, што некаторыя партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі апартуністычна аднесьліся да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы, якой зьяўляецца асеньня-зімовыя перавозкі гэтага году.

Матар'ял са Жлобіна аб становішчы ў раёне цягавай гаспадаркі, які мы сёньня зьмяшчаем, гаворыць аб тым, што справа з паравозным паркам пастаўлена далёка неадавальняюча. Спэцрамонт да вызначанага тэрміну ня скончаны. Асабліва адстае Асіпавіцкі раён, які ўвесь час плянецца ў хвасьце, ня выконваючы сваіх заданьняў.

Дрэнна пастаўлена справа і з якасьцю спэцрамонту. Дагэтуль не ўрэгулявана пытаньне з гаспадарчым разьлікам па дэпо, у выніку чаго мае месца вялікае перарасходваньне фонду зарплаты.

У выніку двух конкурсаў спараных брыгад, якія раней былі праведзены, паравозны парк СССР у тым ліку і БССР, быў значна аздароўлены. Але-ж за апошні час наглядаецца паслаблены не ўвагі з боку чыгуначных арганізацый да гэтага важнейшага пытаньня.

НКШЗ і ЦК саюзу чыгуначнікаў з першага лістапада рашылі арганізаваць III Усесаюзны конкурс спараных брыгад, які ставіць перад сабой мэту замацаваньня посьпехаў дасягнутых у першых конкурсах і далейшага аздараўленьня паравознага парку.

НКШЗ асігнаваў для гэтай мэты 1 млн. рублёў. Для прэм'яваньня ж-дыспэтчэраў, паравозных, вагонарэмонтных брыгад і іншых удзельнікаў, якія актыўна дапамагалі і дапамагаюць у рабоце спараных брыгад, асігнавана 250 тыс. рублёў.

Чыгуначным арганізацыям БССР трэба зараз-жа правесьці падрыхтоўчую работу для таго, каб як належыць, па-бальшавіцку, падрыхтавацца да III конкурсу спараных брыгад.

Слаба яшчэ адчуваецца работа дэпутацкіх груп чыгункі, слаба разгортваецца таксама барацьба за сьцяг ЦВК БССР на лепшае дэпо.

Ліквідаваць прарыў на чыгуначных вузлах і станцыях па ўсіх зьвеньнях транспарту і па-бальшавіку правесьці асеньня-зімовыя перавозкі гэтага году—ганаровая задача ўсіх партыйных і гаспадарчых арганізацый чыгункі.

Пры ўмовах сапраўднага бальшавіцкага ажыцьцяўленьня 6-ці умоў тав. Сталіна, пры ўмовах перабудовы партыйна-масавай работы ў партыйных арганізацыях на чыгунцы і рацыянага палепшаньня работы дэпутацкіх груп і саветаў, транспарт можа справіцца і справіцца з тымі задачамі, якія зараз перад ім стаяць.

Надыходзіць XV гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Новымі перамогамі, новымі посьпехамі і ліквідацыяй усіх прарываў у падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак павінны сустрэць рабочыя чыгункі вялікае сьвята працоўных СССР і пралетарыяту ўсяго сьвету—XV гадавіну Кастрычніка.

Дзяжурны на ст. Бранск, не затрым ліваючы таварнага цягніка, перадае пуцёўку машыністу.

Дэпо Жлобін зрывае падрыхтоўку да перавозак

Неадкладна ўзмацніць работу дэпо, рэалізаваць у рабоце 6 гістарычных умоў т. Сталіна

Жлобін. (Ад нашай брыгады)

Асеньня-зімовыя перавозкі фактычна распачаліся, але Жлобінскі раён, яго цягавая гаспадарка ўступае ў перавозкі з ня зусім гатовым паркам паравозаў. Спэцрамонт павінен быў быць скончаны 15 жніўня, а ў Жлобінскім раёне ён скончаны пакуль што ўсяго ў дэпо Жлобін і Магілеў. Па дэпо Асіпавічы не прапушчаны яшчэ праз спэцрамонт 5 паравозаў. Раён фактычна ў ганебным прарыве па выкананьні адзняй з важнейшых гаспадарчых кампаній.

Рамонт, што ўжо зроблены, мае цэлы рад хібаў, якія гавораць аб дрэннай рабоце партыйнай, прафэсіянальнай і гаспадарчай арганізацый, аб яўнай недадацэнцы сур'ёзнага значэньня спэцрамонту. Рамонт рабіўся бясплянава, неарганізавана. Характарны прыклад: дэпо Магілеў выпусьціла ў ліпені са спэцрамонту 1 паравоз, у жніўні—6. Ня было графіку пастаноўкі паравозаў на рамонт. Адсюль шмат лікасьць пастаноўкі вагонаў на рамонт, няправільная расстаноўка рабочай сілы, дрэннае яе скарыстаньне, ганебныя выпадкі недобраякаснасьці рамонтных работ.

Хіба не яскравы доказ дрэннай арганізацыі рамонту тое, што ў ліку прапушчаных праз рамонт паравозаў 20 проц. адрамантавана так, што трэба або ставіць іх зноў на рамонт, або траціць вельмі многа часу на перапрацоўку. У дэпо Жлобін сьведкамі такой «якасьці» рамонту зьяўляюцца паравозы 3523, 2961. Паравоз 5026 пасьля спэцрамонту ходзіў з трубамі, якія цяклі. Па дэпо Магілеў дрэнна адрамантаваны паравозы 78, 406. У Асіпавічах амаль кожны паравоз выпушчаны ў стане ледзь ня горшым, чым да рамонту. Паравоз 7278 у часе гарантыйнага прабегу выявіў 30 пунктаў рамонту, які ня быў выкананы. Паравоз 7434 два разы быў у спэцрамонце, а брыгады ўсё-ж такі адмовіліся яго прыняць. Дрэнна адрамантаваны паравозы 5057, 5441 і паравоз 4641. Паравозы 5057, 5441 рамантаваліся два разы, а ўсё роўна працягваюць у дымагарных труб і сувязі. Да гэтага можна дадаць, і тое, што прамыўкі паравозаў робяцца ў Асіпавічах дрэнна, без нагляду, некаторыя паравозы па 8 разоў на месяц маюць вальцоўку труб.

Асабліва ганебным зьявішчам трэба лічыць, тое, што ў дэпо Жлобін, якое для дрэнна абсталяванага Асіпавіцкага дэпо зьяўляецца буксірным і робіць для яго спэцрамонт яшчэ да гэтага часу ня зжыты адносіны да асіпавіцкіх паравозаў, як да «чужых». Іх рамантуюць у апошнюю чаргу, рамонт робяць абыяк. Яшчэ адзін абуравочы факт: Асіпавіцкі паравоз 868 прастаяў у Жлобіне на рамонце 65 дзён замест нармальна даных 8, а вышаў з рамонту пакалечаным і адразу ізноў стаў на рамонт у Асіпавічах. І калі ў Асіпавічах ёсьць пяць паравозаў, што не прайшлі спэц рамонту, а астатнія патрабуюць паўторнага рамонту, калі дэпо не гатова да асеньня-зімовых перавозак, дык тут значная доля віны і адказнасьці кладзецца на дэпо Жлобін. І ня дзіва, што адкрыты партсход паравозьнікаў дэпо Асіпавічы, канстатуючы негатоўнасьць дэпо да перавозак, вылучыў спэцыяльную брыгаду для пасылкі ў Жлобін з мэтай прад'явіць рабочым дэпо сацыялістычны рахунак.

Паўстае пытаньне: як-жа адносіцца да такіх ненармальных паводзін дэпо Жлобін аддзел цягі раёну? Ён ведае пра агідныя зьявішчы, разумее іх шкоднасьць, але зусім нічога ня ўжыў для іх адхіленьня. Апартуністычнае благадушша перамагае.

Праводзячы адказныя работы па рамонце паравозаў, аддзел цягі не паклапаціўся ўмацаваць на дэпо гаспадарчы разьлік, нізавое плянаваньне. Неразьбярыха ў работах давяла да таго, што за першы квартал перарасход на трансфінпляне дасягнуў 65.148 руб., за другі квартал разам з ліпенем і жніўнем—да 80 тыс. руб.

І гэта ўсё амаль выключна па рабочай сіле. Вось вынік нерацыянальнага скарыстаньня рабочай сілы, паўторных рамонтаў, недаробак. Гаспадарчы разьлік праводзіцца на паперы. Трансфінплян разьвёрстаны па брыгадам, але ні кіраўнікі дэпо, ні брыгады яго не заглядалі. Плян плянам, а нікудышная работа сама па сабе! Калі запытацца ў гаспадарнікаў, якошт рамонту, як ён дыфэрэнцыруецца, дык адказу не пачуеш, бо... фінансавая справаздачнасьць складзена толькі за май.

І на сёньня мы маем, тое, што апрача дрэнна зробленага ды фактычна ня скончанага рамонту, сярэдні сутачны прабег паравозу за апошнюю дэкаду жніўня—187,7 пры заданьні 194. Карысная работа паравозу 10, пры заданьні ў 11,8. Калі адкінуць перабої ў руху па віне эксплёатацыі, дык толькі 72,4 проц. цягнікоў прасьледавала па раскладзе (жнівень). Было 635 выпадкаў спазьненьняў. Дрэнна з замацаваньнем спаранай язды. Па адным дэпо Жлобін за жнівень было 240 выпадкаў зрываў спаранай.

Да такой ганебнай работы прывяло паслабленая чуласьць кіруючых арганізацый дэпо, апартуністычны правы падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак і дрэннае правядзеньне ў жыцьцё шасьці гістарычных паказаньняў тав. Сталіна. Трэба адзначыць і шкодную сьлепату аддзелу цягі раёну; ён нічым не дапамагае мясцом. Яго тэхнічныя сілы, інструктары, рэвізоры заняты толькі тым, што наведваюць дэпо, каб паглядзець, калі праверены маноманэтры, катлы. Яны зробяць запіс у кнігу і хутчэй праз другія вароты на цягнік. Склікаць тэхнічную нараду, абмеркаваць становішча, выкрыць прычыны прарываў, дапамагчы ліквідаваць іх—усё гэта не зьяўляецца асновай работы кваліфікаванага аддзелу цягі. Тут спадзяюцца на шчасьлівы самацёк.

Гэтыя спадзяваньні яскрава можна бачыць і на ня менш адказным участку работы аддзелу цягі—вадазабясьпечаньні, электрагаспадарцы. Рамонт вадапомпаў праведзены дрэнна, калёнкі і калодзежы да зімы не падрыхтаваны. Пра кадры і ня думалі, і ў выніку, з-за няўмелага абыходжаньня, ёсьць паломкі машын у Асіпавічах, Шацілках і Жлобіне.

Становішча, што стварылася на сёньня ў цягавай гаспадарцы Жлобінскага раёну, патрабуе хутчэйшых і абкладных мерапрыемстваў для зьмяшчэньня ўсіх недахопаў, якія нагадваюцца за апошні час па цягавай гаспадарцы раёну.

Ташын, Данілаў.

Пра саракагадовы юбілей літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Асьветы БССР і Арг. Камітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў

25-га верасьня 1932 г. спаўняецца 30-годзьдзе грамадзкай літаратурнай дзейнасьці найвялікшага пісьменьніка Савецкага саюзу—Максіма Горкага, заснавальніка сваё жыцьцё, змаганьне і творчую працу з лёсам гераічнага пралетарыяту, з лёсам сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Імя Максіма Горкага карыстаецца вялізарнай папулярнасьцю як сярод мільённых мас працоўных Савецкага саюзу, так і сярод працоўных усяго сьвету і цесным і непарыўным чыгам зьвязана з узьдымам грамадзка-палітычнага жыцьця ў 90-ым годы мінулага стагодзьдзя. Ён неадрыўны ад усяго далейшага росту і разьвіцьця рэвалюцыйнага руху ў Расіі, які быў завершаны пралетарскаю рэвалюцыяю і стварэньнем пралетарскай дзяржавы на адной б-ай частцы зямлі.

Ён працягу ўсёй сваёй сваўнай дзейнасьці Максім Горкі заклікае працоўныя масы да адданай вялікай барацьбы за сьветлую будучыню. Мастацкім словам сваім ён мужна змагаўся з былой «Акураўскай» Расіяй—Расіяй рабства, прынёму, зьдзекаў, Расіяй самаадаволенага мяшчанства, зьвярынай дзікасьці, шэрага бяспрасьветнага існаваньня мільёнаў. Расіяй сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. Уся творчасьць Максіма Горкага ў мінулым была вязгасаючым палымяным пратестам і гарачым заклікам да барацьбы супроць аджываўшага свой век дзікага расійскага царызму, прыдушаўшага ўсё жывое і свабодалюбівае ў былой «турме народаў», якой зьяўлялася імпэратарская Расія. Вялікая папулярнасьць Максіма Горкага была абумоўлена сацыяльнай накіраванасьцю творчасьці, якая йшла на той-жа мэце, па якой разьвіваліся грамадзянскія настроі найшырэйшых пластоў насельніцтва, якія былі нездаволены існаваўшым складам жыцьця.

Пачаўшы сваю літаратурную і дзейнасьць у 1892 годзе надрукаваньнем першага апавяданьня «Макар Чудра», Максім Горкі даў низьлічоны рад блістотных мастацкіх твораў, узбагаціўшых скарбніцу ня толькі Расійскай, але і сусьветнай літаратуры, твораў, кожны з якіх быў адточанай баявой стралой супроць безладзьдзя, цемры, супроць эксплёатацыі «мракабесія», і расійскага капіталізму. За апошнія гады сваёй літаратурнай работы Максім Горкі даў нам манумэнтальныя творы «Дело Артамоновых» і трылёгію «Жизнь Клима Самгина», якія ахапляюць цэлыя пастагодзьдзі грамадзка-палітычнага жыцьця нашай краіны, мастацкі адлюстроўваюць гэтае жыцьцё, даюць верны аналіз тым складным сацыяльным эрухам і падзеям, якія адбываліся ў бывалешняй грамадзе, дапамагаюць нам вывучаць мінулае і будаваць новае сьветлае, імя чаму—бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Як пісьменьнік, як мастак, Максім Горкі мае сусьветнае імя. Ён карыстаецца выключнай павагай сярод прыгнечаных, эксплёатуемых мас усяго сьвету, як палымяны барацьбіт за лепшую будучыню чалавецтва, як непрымірымы вораг сусьветнага мяшчанства, спад якім адлдзеньнем яно не хавалася б, пад якімі маскамі яно не выступала-б. Недарма з такой шалёнай, аз пала-б. Недарма з такой шалёнай, аз ная буржуазія да Максіма Горкага, мужнага барацьбіта за вялікую пралетарскую праўду.

Максім Горкі дарагі нам ня толькі, як вялікі сусьветна-вядомы пісьменьнік. Ён зьяўляецца і выдатнейшым дзеячом у справе будаўніцтва нашай пралетарскай культуры. Мы ня знойдзем ні аднае больш менш буйнае справы на фронце нашага культурнага будаўніцтва, якая ня была-б так ці інакш зьвязана з імем Горкага. Максім Горкі—ініцыятар стварэньня «гісторыі грамадзянскай вайны», «гісторыі фабрык і заводаў». Максім Горкі наладжвае выданьне «гісторыі маладога чалавека XIX стагодзьдзя». Максім Горкі прымае чынны ўдзел у кожным новым пачынаньні на фронце нашага культурнага будаўніцтва. Ён прымае блізкі ўдзел у разгортваньні рабселькораўскага руху, дапамагае наладжваньню творчай вучобы начынаючых пісьменьнікаў і г. д. Максім Горкі, прымае блізкі ўдзел і на другіх франтох нашага будаўніцтва. Ён непасрэдна ціхавіцца і прымае актыўны ўдзел у кожным мерапрыемстве Камуністычнай партыі і Савецкай улады, накіраваным на далейшы рост і росквіт краіны (канфэрэнцыі па барацьбе з засухай, выступленьне ў друку па дзяржаўных пазыках, па пытаньнях калектывізацыі і г. д. і г. д.).

Максім Горкі праводзіць вялікую работу па арганізацыі адзінага пралетарскага фронту супроць інтэрвэнцыі нісцкага нападу на Савецкі саюз, нападу, які рыхтуе супроць пралетарскай дзяржавы сусьветная буржуазія. Разам з Ромэнам Ролянам і Анры Барбюсам ён прымае актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзеньні Амстэрдамскага антываеннага кангрэсу.

Вось чаму Максім Горкі карыстаецца такой выключнай павагай і пашанай сярод шматмільённых мас працоўнага насельніцтва Савецкага саюзу, у тым ліку і працоўных Савецкай Беларусі.

Народны камісарыят асьветы і арганізацыйны камітэт Саюзу савецкіх пісьменьнікаў Беларусі зьвяртаецца да пралетарскай грамадзянскасьці з заклікам прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні славутага юбілею вялікага пралетарскага пісьменьніка. Ніводны рабочы клюб, ніводная школа, бібліятэка, кіно, тэатр, літгурток і інш. не павінны быць у баку ад вялікага юбілею, які зьяўляецца адначасова юбілеем усёй нашай пралетарскай культуры. Дні правядзеньня юбілею павінны быць шырока скарыстаны для далейшага ўмацаваньня і росту нашага ленінскага нацыянальна-культурнага будаўніцтва, пашырэньня культурнага дабрабыту працоўных.

Наркомасьветы і арг. камітэт ССП лічуць з свайго боку патрэбным правядзеньне наступных практычных мерапрыемстваў у сувязі з юбілеем.

1. Правядзеньне ў рабочых клюбах, школах, бібліятэках, дамох сацкультуры спэцыяльных літаратурных вечароў, арганізацыю выставак, прысьвечаных юбіляру.

2. Правядзеньне па гарадох і раённых цэнтрах агульна-гарадзкіх і раённых масавых літаратурных вечароў, далучэньне такіх-жа вечароў на фабрыках і заводах, саўгасах, калгасах і вёсках.

3. Пастаноўку ў тэатрах п'ес Максіма Горкага.

4. Дэманстраваньне ў кіно фільм, напісаных паводле твораў юбіляра.

5. Правядзеньне ў школах і навучальных установах спэцыяльных заняткаў на тэму аб творчасьці Максіма Горкага.

6. Шырокую папулярызацыю літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага ў нашай пэрыядычнай і не пэрыядычнай прэсе (газэты, часопісы, брашуры).

7. Правядзеньне ў літ. гурткох цыклю заняткаў на тэму аб значэньні Горкага ў агульна-сацыяльнай і сусьветнай літаратуры, аб творчым мэтадзе юбіляра.

8. Наданьне імя Горкага найлепшым школам, клюбам і бібліятэкам.

9. Стварэньне штогадовай прэміі імя Максіма Горкага за найлепшыя літаратурна-мастацкія творы; устанаўленьне стыпэндый у ВНУ імя Максіма Горкага.

10. Арганізацыі пры Дзяржбібліятэцы цэнтральнай выстаўкі, прысьвечанай юбіляру.

11. Пераклад асноўных твораў Максіма Горкага на беларускую мову.

Сыгналы газэты не пачуты

На Бабруйскім лесакамбінаце як і раней у вырабе шырспажыву пануе бесплянасьць. Рабочыя ўтыльцэху ня ведаюць норм і расцэнак. Адыходы спальваюцца

ПАШЫРЫЦЬ ВЫРАБ, ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ

З кожным днём усё шырэй і шырэй разгортваецца савецка-калгасны рынак, які патрабуе вялікага сустрэчнага патоку дадатковых тавараў шырокага спажываньня. Вось чаму пашырэньне вырабу тавараў шырокага спажываньня навіна, як ніколі, стаць у цэнтры ўвагі ўсіх гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый заводаў і фабрык сацыялістычнай прамысловасьці БССР.

Мы маем вялізарнейшыя посьпехі на гэтым важнейшым гаспадарча-палітычным вучастку. Некаторыя заводы і фабрыкі ў БССР ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць свае плянавыя заданьні. Але ёсьць і такія заводы, кіраўніцтва якіх з апартуністычнай недацэнкай адносяцца да выкананьня важнейшай дырэктывы апошняга пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні савецка-калгаснага гандлю і аб поўных задавальненьні сапраўднага базару тавараміі шырокага спажываньня.

Ня так даўно на стронках нашай газэты мы сыгналізавалі аб тым, што кіраўніцтва Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату адмахваецца ад пашырэньня вырабу шырспажыву. Сёньня мы вымушаны зноў канстатаваць аб той небяспецы, якая наглядаецца на Бабруйскім лесакамбінаце па справе пашырэньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня.

Сёньнешні матар'ял яскрава сьведчыць аб тым, што на камбінаце ў вырабе прадуктаў шырокага спажываньня пануе бесплянавая «пляна навасьць»—цэхі, у якіх вырабляюцца тавары шырспажыву, абязьлічаны, выпускаецца прадукцыя дрэннай якасьці, рабочыя ня ведаюць сваіх норм і расцэнак, адыходы вытворчасьці, як і раней, ідуць у качагарку на паліва, а вырабы тавараў шырспажыву вытвараецца па з дабраякасных матар'ялаў.

Мы патрабуем ад трохкутніка камбінату неадкладнай перабудовы яго работы, скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй да пашырэньня вырабу тавараў шырокага спажываньня, уцягненьня ўсёй рабочай грамадзкасьці камбінату ў гэту важнейшую і адказнейшую справу.

Мы зьвяртаемся да дэпутацкай групы савету Бабруйскага камбінату з прапановай, каб яна ўзяла пад свой штодзенны пралетарскі кантроль гэты найвялікшай важнасьці гаспадарчы вучастак работы, прымусіць кіраўніцтва камбінату выканаць рашэньні пленуму ЦК і ЦКК КП(б) аб шырспажыве.

Для гэтага на Бабруйскім лесакамбінаце ёсьць усе магчымасьці, трэба толькі па-бальшавіцку ўзяцца за гэту справу. Мы спадзяемся, што дэпутацкая група камбінату, як сьлед возьмецца за гэту справу і зробіць круты пералом у пашырэньні вырабу тавараў шырокага спажываньня.

Калі на лесакамбінаце наступіць пералом?

Разгортваньне вырабу прадметаў шырспажыву, на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце яшчэ і да гэтага часу не наладжана. Грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня не мабілізавана. У паасобных цэхах наладзецца «цэхаўшчына» ў справе вырабу шырспажыму. Аб гэтым сьведчаць меўшыя месца спрэчкі на рабочай канфэрэнцыі па шырспажыве, якая адбылася 5-га верасьня. г. г.

На камбінаце ўся работа па складаньні плянаў па вырабе шырспажыву праходзіць міма рабочай грамадзкасьці. Пляны выпрацоўваюцца габінэтным парадкам. Аб гэтым гаворыць наступныя факты: стандартнаму цэху на другое паўгодзьдзе дано заданьне выраблць 7500 столікаў, прычым 4000 штук з іх павінны былі быць зроблены за дзьве дэкады верасьня, а за ўвесь 4-ты квартал ўсяго 3500 столікаў. Такія факты плянаваньня ёсьць у Белцэху і па іншых цэхам.

Рабочыя, якія працуюць па вырабе, ня ведаюць нормы, ня ведаюць сваіх расцэнак (Белцэх).

Конкурс, які праводзіўся па шырспажыве, прайшоў бяз удзелу грамадзкасьці. З 4500 рабочых у конкурсе ўдзельнічала ўсяго 8 чалавек і то большасьць з іх адмтэхнэрсанал.

Белцэх на працягу 3 і 4 кварталу плянуе выраблць 5000 кухонных столікаў, 6000 табурэтак і 1000 штук этажэрак канструкцыі камбінату, прычым за 3-ці квартал Белцэх павінен даць кухонных столікаў 1000 штук і этажэрак 500.

Як Белцэх выконвае свой плян? Дрэнна. Сярод кіруючай галоўкі Белцэху не адчуваецца адказнасьці за гэту справу, выраб шырспажыву абязьлічаны, дэталі для вырабу шырспажыву выпрацоўваюцца выпадкова, у той самы час калі паасобныя станкі зусім стаяць, напрыклад: 4-IX з аддзаленьня па вырабе шырспажыву было накіравана на фрэзэрны вартат 400 дзьвярэй, гэтыя дзьверы пралежалі ў цэху на працягу сутак і іх вярнулі неапрацаванымі назад з пакаяньнем майстра Кісялёва, на тое, што гэтую работу трэба рабіць рукамі; у гэты-ж час фрэзэр стаяў без работы. Пры гэтым 14 дзьвярэй па дарозе былі згублены.

На якасьць вырабу шырспажыву тэхнагляд Белцэху не зьвяртае ніякай увагі.

Вынікі такіх адносін адбіваюцца на выкананьні пляну. На сёньнішні дзень з патрэбных 1000 кухонных столікаў зроблена ўсяго 200; 527-жа столікаў знаходзяцца ня скончанымі, а аб этажэрках вічога ня чуваць.

У сыстэме вырабу шырспажыву значную ўвагу трэба зьвярнуць на патрабаваньне спажыўца для якога вырабляецца подмет.

Гэтага на камбінаце няма, вырабляюцца рэчы, а ці падыдуць яны да спажыўца ці не, аб гэтым ніхто ня турбуецца.

Напрыклад, стандартны цэх выраблае столікі для калгаснага рынку, але трэба сказаць, што гэтыя столікі для сялянскай сям'і вельмі малыя, яны разьлічаны ня больш, чым на тры-чатыры асобы. Такое становішча і з кухоннымі шафачкамі. Трэба заваторыць вялікую ўвагу на тое, каб выраб лясмыя цэхамі камбінату тавары шырокага спажываньня адпавядалі-б патрэбам спажыўца.

Канфэрэнцыя адзначыла, што кіраўніцтва камбінату ў сваіх плянах ня ўлічыла ўсіх тых магчымасьцяй, якія ёсьць на камбінаце, напрыклад, вялікія магчымасьці ёсьць у цэху лесагрупы, якая можа выраблять бачкарку, гонт, але гэта яшчэ і да сёньняшняга дню не скарыстоўваецца. Камбінат не скарыстоўвае ўсе свае адыходы на вырабе шырспажыву, яны, як і раней, спальваюцца ў качагарцы, у той час, як стандартны цэх выраблае тавары шырспажыву з добраякаснага матар'ялу.

Канфэрэнцыя вызначыла цэлы рад практычных мерапрыемстваў па разгортваньні вырабу шырспажыву. Яна выказалася за арганізацыю спэцыяльнага фонду тавараў шырспажыву да надыходзячага раённага кірмашу, які адбудзецца 14 кастрычніка. Для зьніжэньня разрыву ў вырабе шырспажыву з запатрабаваньнямі калгаснага рынку канфэрэнцыя пастанавіла ў бліжэйшы час склікаць нараду рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу тых цэхаў, у якіх вырабляюцца тавары шырспажыву, сумесна са спажыўцамі.

Раённае ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб пашырэньні вырабу шырспажыву павінна стаць баявой праграмай для ўсяго рабочага калектыву камбінату.

С. Каган.

ЗВОДКА

аб выкананьні прамфінпляну па шырспажыву па заводзе імя Варашылава за жнівень месяц 1932 г

Галоўныя вырабы	Плян: Колькасьць	Плян: Сума у руб.	Проц. выкананьня
Падковы	1500	2250	96,8
Шворны	150	400	250,0
Трыножкі	200	400	112,5
Завесы	6000	7800	191,6
Крукі	6000	2700	83,3
Накладкі, клямкі з прабоямі	1000	1000	—
Дзьверныя клямкі	200	600	100,0
Падскі	1000	1000	—
Адвалы	1417	6802	52,9
Лемяхі	1000	2000	50,0
Палкі да плугоў	1000	700	—
Шыны	600	2700	44,4
Сковароды вялікія	—	—	—
» малыя	—	—	—
Разам па заводзе	—	30052	105,8

У Бабруйску слаба вядзецца барацьба са зладзеямі і спэкулянтамі

Барацьба за ахову грамадзкай маемасьці, за яе недатыкальнасьць, барацьба са спэкуляцыяй яшчэ ня стала ў цэнтры ўвагі арганізацый раёну.

А фактаў раскраданьня грамадзкай маемасьці і спэкуляцыі ў Бабруйшчыне ёсьць значная колькасьць. Возьмем для прыкладу ЗРК камбінату. Тут у якасьці загадчыка крамы ІТР працаваў на працягу доўтага часу Гельфанд, які сыстэматычна займаўся расхрадваньнем каапэрацыйнай маемасьці, перадаючы тавары родзічам, якія перапродавалі на рынку.

Ня лепшае, што робіцца і ў малочнай краме ЦРК. Загадчык яе Катвіцкі штодзенна перадае сваім знаёмым значную колькасьць масла, якое так сама пасьля трапляе на базар па спэкулянцкіх цэнах.

Значныя пакражы і спэкуляцыя збожжа маюць месца ў калгасах раёну. У калгасе «Камінтэрн» (Рымавецкі сельсавет) былы старшыня і сябр праўленьня Халімонаў на працягу доўтага часу распрадавалі калгаснае збожжа пад відам здачы яго па загатоўках і грошы бралі сабе.

Абразаньне каласоў мела значнае месца ў калгасе імя Молатава (Рымавецкі сельсавет. Калгасьнікі падавалі калектыўную заяву ў суд аб прыцягненьні злодзея Храмелі да судовай адказнасьці. Але суд два месяцы марынаваў справу і толькі пасьля другога лісту калгасьнікаў у газэту, з рашучым патрабаваньнем прыцягнуць да судовай адказнасьці Храмелю, нарэшце разгледзеў гэтую справу.

А. Д.

Кожнай брыгадзе, калгасу, саўгасу—баявую апэрацыйную штодзёнку

Больш клопатаў і ўвагі рабселькораўскаму руху

За апошні час мы дабіліся значных посьпехаў у галіне перабудовы ўсёй работы нізавога друку і рабселькораўскага руху. Аб гэтым сьведчыць разгортваньне сеткі раённага друку і нізавых насьценных газэт на прадпрыемствах, у цэхах, брыгадах, групах, агрэгатах, у калгасах, саўгасах, МТС і г. д.

Аднак, па некаторых паасобных раёнах мы маем цэлы рад прарываў у сэнсе разгортваньня нізавога друку і рабселькораўскага руху. Ад гэтым гаворыць матар'ял, які мы сёньня друкуем. У раёнах ёсьць выпадкі цікаваньня селькораў з боку паасобных раённых работнікаў і ў паасобных выпадках нават пагрозы забойствам.

Тав. Кагановіч, гаворачы аб рэагаваньні на лісты рабочых і калгасьнікаў на IX зьезьдзе прафсаюзаў сказаў: «З ўсіх відаў прафсаюзнай статыстыкі самы неабходны—гэта ўлік рэзультатаў рабочых лістоў, заяў, прапаноў і скаргаў».

Гэтыя словы тав. Кагановіча яшчэ ня ўсімі ўстановамі і арганізацыямі ажыцьцяўляюцца на справе. Некаторыя кіраўнікі раёнаў забываюць, што, адлюстроўваючы бурны творчы ўздым працоўных мас, нізавы друк і рабселькораўскі рух зьяўляюцца адначасова актыўнейшымі арганізатарамі мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, надзейнымі памочнікамі партыйных арганізацый у барацьбе за генэральную лінію партыі А забываць гэтага партыя ніколі нікому не дазволіць.

Задача партарганізацый і раённага друку заключаецца ў тым, каб замацаваць новыя рады рабкораў, зрабіць з іх сапраўдных актыўных удзельнікаў бальшавіцкага друку і перадавікоў на прадпрыемствах.

У час правядзеньня конкурсу «Праўды» на лепшую работу нізавога друку па арганізацыйна--гаспадарчым умацаваньні калгасаў мы мелі вялікі зрух у справе разгортваньня работы нізавога друку. Большасьць шматты ражак, насьценных газэт набылі багацейшы вопыт апэрацыйна-масавай работы. Гэты вопыт, які быў распаўсюджаны ў час веснавой сяўбы, павінен быць замацаваны і памножаны ў час правядзеньня ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Як на буйнейшы недахоп ў радзе раёнаў трэба ўказаць на недастатковасьць работы нізавога друку на палёх у час сацыялістычнай ўборкі ўраджаю. Ня ўсе брыгадныя штодзёнкі, насьценгазэты маглі-б вялікую работу прарабіць у справе разгортваньня масава - растлумачальнай работы на полі. Растлумачэньне калгасьнікам і аднаасобнікам важнейшых пастаноў партыі і ўраду—баявая задача кожнай газэты.

Мы патрабуем ад партыйных ячэек і рэдакцый райгазэт, каб у кожнай брыгадзе, калгасе, МТС быў наладжан выпуск насьценгазэт, чаго на сёньнішні дзень яшчэ няма. Ёсьць такія калгасы, якія ўжо існуюць па 3—4 гады і ў іх зусім ня выходзіць на сьценгазэта. З такімі аднасінамі да нізавога друку трэба раз назаўсёды пакончыць.

Штодзённае канкрэтнае і практычнае партыйнае кіраўніцтва, добрая арганізацыя работы, масавасьць у рабоце павінны забясьпечыць далейшае разгортваньне нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Нізавы друк—лепшы памо'нік у выкананьні прамфінпляну

Згодна пастановы Менгаркому КП(б)Б, з 20-га жніўня па 10-га верасьня праводзілася справаздачна-перавыбарчая кампанія рэдкалегій, шматтыражак і насьценгазэт. Гэта кампанія павінна была прайсьці пад адзнакай далейшага павышэньня ролі друку як самай вострай, самай моцнай зброі ў руках партыі, мабілізацыі шырокіх працоўных мас на выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных задач на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Завод «Камунар» усю масава-палітычную работу па справаздачна-перавыбарчай кампаніі нізавога друку праводзіў пад лёзунгамі выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну III кварталу. Пад кіраўніцтвам парткалектыву шматтыражка «Камунаравец» выпускала спэцыяльныя нумары, прысьвечныя справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Праводзіліся агульныя сходы рабочых, на якіх заслухоўваліся справаздачы аб рабоце шматтыражкі і аб далейшых задачах нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Дзякуючы своячасоваму рэагаваньню на сыгналы газэты, рабочыя і служачыя заводу «Камунар» узялі на сябе абавязацельства ў III квартале выйсьці з паласы прарыву. Аднак, на заводзе яшчэ ёсьць шмат недахопаў. Прамфінплян па заводзе за ліпень месяц выкананы ўсяго на 59 проц., за жнівень—84,5 проц. Гэта гаворыць за тое, што ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі цэхавыя партячэйкі недастаткова мабілізавалі нізавы друк і рабочыя масы вакол важнейшых задач.

Ёсьць такія сакратары ячэек, якія па-апартуністычнаму адносяцца да нізавых газэт, яўна недацэньваючы ролі іх, як памочніка ў выкананьні гаспадарча-палітычных задач. Сакратары ячэек сьлясарна-зборачнага і загатоўчага аддзелаў, т.т. Лютарэвіч і Залатарэвіч не палічылі патрэбным у час справаздачна-перавыбарчай кампаніі абмеркаваць на бюро пытаньне аб арганізацыі новых штодзёнак у цэху. Тав. Кісялёў—сакратар ячэйкі сьлясарна-мэханічнага цэху разважае так: «Перш за ўсё прамфінплян, а потым штодзёнкі», не разумеючы таго, што нізавы друк—лепшы памочнік у выкананьні прамфінпляну.

Бюро парткалектыву трэба неадкладна ўзварушыць гэтых сакратароў ячэек, арганізаваць штодзёнкі ў тых брыгадах, дзе яны не арганізаваны, уцягнуць усіх рабочых у рады ўдарнікаў, рабселькораў, пад адзнакай далейшага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, узмацненьня барацьбы супроць скажэньняў лініі партыі.

Павышэньнем ролі заводзкага друку і рабселькораўскага руху, як арганізатара шырокіх працоўных мас, на аснове ажыцьцяўленьня 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна пасьпяхова выканаем плян 4-га заключнага году першай пяцігодкі.

Санкевіч.

На 45 насьценных лісткоў няма адказу

Пастанова прэзыдыуму ЦКК Усе КП(б) і калегіі НК РСІ СССР ад 22 жніўня зусім выразна гаворыць за тое, што «да расьсьледваньня лістоў і допісаў павінна быць прыступлена ў дзень атрыманьня іх на месцы ў раёцца ў найкарацейшы тэрмін, з прыцягненьнем да гэтай работы масавых арганізацый садзейнасьці РСІ».

Ня гледзячы на гэта, сотні скаргаў рабочых, калгасьнікаў і сялян-аднаасобнікаў яшчэ на сёньнішні дзень валяюцца на шафах розных установаў. Газэта «Савецкая Беларусь» ужо ня раз пісала аб тых установах, дзе марнуюцца допісы працоўных; пісаліся напамінкі, але ўсё гэта дарэмна. Між тым рабочы, калгасьнік, аднаасобнік, даслаўшы ліст у рэдакцыю, чакае хутчэйшага адказу—яго цікавіць лёс допісу.

Аднак некаторыя рабочнікі ўстаноў ня хочуць гэтага зразумець. Сваім нежаданьнем рэагаваць на допісы і лісты працоўных яны не даюць магчымасьці зьнішчаць тыя недахопы, аб якіх паведамляюць нам селькоры.

Між тым, пастанова прэзыдыуму ЦК УсеКП(б) і калегіі РСІ СССР яснa гаворыць, што пасьля расьсьледваньня «аб рэзультатах зараз-жа паведамляць рэдакцыі газэт, прычым канкрэтных вінаватых, якія не рэагуюць на сыгналы друку і рабселькораўскія допісы, прыцягваць да адказнасьці, апублікоўваючы ў друку прозьвішчы валакітчыкаў». Аднак, з боку некаторых мясцовых органаў РСІ яшчэ мала зроблена на гэтым пытаньні.

З 71 насьценных лісткоў пасланых нашай рэдакцыяй, толькі на 26 ёсьць адказы. Астатнія 45 насьценных лісткоў марынуюцца па розных установах і арганізацыях, ня гледзячы на неаднаразовыя напамінаньні з боку рэдакцыі. Некаторыя лісткі пасылаліся яшчэ ў пачатку мая т. г.

27 мая г. г. селькор Касьцюковіцкага раёну напісаў ў рэдакцыю аб тым, што бухгальтар саўгасу «Сялецк» вельмі ня любіць беларускай мовы. Калі статыстык напісаў бухгальтару па-беларуску, дык апошні падняў страшэнны крык: «Ты лепш бы і паперы не мараў, а калі будзеш так пісаць, дык я табе работы ня дам»—так заявіў т. Дзергачоў (бухгальтар) адносна статыстыка.

Вылазка вялікадзяржаўнага шавінізму зусім відавочна. Аднак, ні кіраўніцтва саўгасу, ні РВК (куды пасланы лісток) гэта ня турбуе. З адказам рэдакцыі яны не сьпяшаюцца.

З Полацкага раёну ў рэдакцыю паступіў ліст, у якім гаворыцца аб бесгаспадарчасьці ў калгасе «Новы Шлях». Прапажа сьвіней, бульбы і іншай маемасьці—у калгасе нармальнае зьявішча. Няма і кіраўніцтва калгасам. У час сяўбы на работу выходзілі ў 10-11 гадзін, абедзены перапынак 3-4 гадз. У калгасе няма самапаборніцтва і ўдарніцтва, поўная абязьлічка і г. д.

Т. Гаркавенка ў сваім лісьце ў рэдакцыю паведамляе аб тым, што чужы элемэнт пралезшы ў калгас «За ўраджай», Лапіцкага сельсавету, Асіповіцкага раёну, прывёў яго амаль да поўнага разбурэньня. Кулацкая хваля пралезшы ў калгас разам з старшынёй Усаем разбазарыла ўсю абагуленую маемасьць. Калгасныя будынкі аднаасобнікамі разабраны на дровы. Асабліва праявіў сябе ў гэтым сакратар праўленьня калгасу Захарэвіч, які вельмі частка крычаў па адрасе яўрэяў—калгасьнікаў: «Прыйдзе вайна, пойдзем жыдоў біць». У выніку гэтага з 21 яўрэйскай гаспадаркі быў шых у калгасе, зараз засталіся толькі дзьве.

Гэтаму патураў і сельсавет. Каді чырвонаармеец Гурэцкі выступіў з крытыкай адносна Захарэвіча, дык яго выключылі з калгасу, абклалі індывідуальна, раскулачылі і выслалі. Захарэвічу сельсавет выдаў дакументы для паездкі «ратаваць» высланую кулачку Саноцкую, якая мела 20 валок зямлі. Факты, здаецца, б'юць проста ня ў брыво, а ў вока. Але як райкалгассаюз, так і райпракуратура ад гэтых фактаў адгарадзіліся высокай сьцяной бюрократызму і нічога ня бачуць што рабіцца вакол іх.

Селькор Чавускага раёну напісаў у рэдакцыю аб тым, што калгас імя Дзяржынскага знаходзіцца пад пагрозай развалу. Згрупаваўшы вакол сябе сваю радню, старшыня калгасу Краўцоў вядзе падрыўную, шкодніцкую работу. Там дзе паводле пляну трэба было засеяць гапуковы ячмень, Краўцоў засеяў просты. Інвэнтар не адрамантаваны. Ёсьць свае кавалі, але «няма вугалю»,—кажа старшыня. Такіх фактаў вельмі многа. За ўсё гэта Краўцоў не нясе ніякай адказнасьці, кажучы,—«у Чавусах яшчэ ніводнага праўленьня ня судзілі, а я больш прыметны, ці што? Сойдзе».

Такіх фактаў можна было-б падаць дзесяткамі, але хопіць і гэтых для ўяўленьня таго, як у некаторых мясцох «рэагуюць» на лісты працоўных.

Часта калі і робіцца расьсьледваньне, дык бяз удзелу масавых арганізацый, фармальна і ў радзе выпадкаў аб выніках расьсьледваньня не паведамляюць рэдакцыю газэты. Такое расьсьледваньне ні ў якім разе ня можа задаволіць ні рэдакцыю, ні селькора, які піша ў газэту.

«Савецкая Беларусь» патрабуе ад мясцовых органаў РСІ і райпракуратуры неадкладнага зьнішчэньня гэтых недахопаў з тым, каб на кожны ліст рабочага, калгасьніка было хуткае і вычарпальнае рэагаваньне.

В. Букчын.

В. Пятрушэня

Да чарговых пытаньняў у плянавай працы

У бліжэйшы пэрыяд часу перад Дзяржпляном, перад гаспадарчымі установамі і арганізацыямі, а таксама перад райпляннамі БССР стаіць рад буйных задач. Даволі будзе адзначыць, што на працягу паўтары-двух месяцаў плянавыя і гаспадарчыя арганізацыі павінны выканаць такія работы як складаньне народна-гаспадарчага пляну на 1933 г., канчаткова прапрацаваць плян на 2-ю пяцігодку і ў бліжэйшы час завяршыць складаньнем пляну на IV квартал бягучага году.

Тэрміны, якія вызначаны ўрадам СССР і БССР для выкананьня гэтых работ наступныя: народна-гаспадарчы плян на 1933 г. Дзяржпляном БССР павінен быць прадстаўлены ў СНК БССР не пазьней 5-га кастрычніка, а наркаматы і цэнтральныя установы матар'ял на 1933 год павінны прадставіць Дзяржпляну не пазьней як 20-га верасьня г. г. Да гэтага-ж тэрміну (20-IX—32 г.) наркамасьветы і цэнтральныя гаспадарчыя арганізацыі павінны таксама прадставіць Дзяржпляну канчаткова прапрацаваны і ўдасканалены матар'ял па 2-й пяцігодцы з тым, каб Дзяржпляну змог прадставіць на разгляд ураду БССР другі пяцігадовы плян 20 кастрычніка г. г.

У сучасны пэрыяд Дзяржпляном СССР распрацоўвае ліміты на 1933 г. для наркаматаў і рэспублік, якія ў самы бліжэйшы час будуць апрыманы і спушчаны, як гаспадарчым цэнтрам, так і райпляннам. А таму гэта цэнтральныя гаспадарчыя арганізацыі павінны неадкладна прыступіць да падвядзеньня вынікаў выкананьня народна-гаспадарчага пляну 1932 году. Неабходна дэталёва, па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, падвесьці вынікі сацыялістычнага будаўніцтва бягучага году, падагуліць тыя вялізарнейшыя сацыяльна-эканамічныя зрухі, якія адбыліся за апошнія гады. Асабліваю ўвагу гаспадарчых, плянавых арганізацый пры падвядзеньні вынікаў работы бягучага году, павінна быць зьвернута на дэталёвае падагульваньне і праверку выкананьня пляну капітальнага будаўніцтва па ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Трэба оказаць, што ня гледзячы на вялізарнейшае народна-гаспадарчае значэньне пытаньняў капітальнага будаўніцтва, фактычны ўлік расходваньня як працовых сродкаў, так і матар'яльных рэсурсаў пастаўлены вельмі дрэнна. Даволі ўказаць на тое, што цэлы рад гаспадарчых арганізацый ня могуць даць адказу на пытаньнях: якія аб'екты будаўніцтва падпарадкаваны данай арганізацыі, ці скончаны яны і якія да гэтага часу ня скончаны і павінны перайсьці на 2-гі гаспадарчы год. Таму ўлік фактычна скончаных да гэтага часу пабудоў і тых пабудоў, якія будуць скончаны да канца гэтага году і вызначэньне аб'ектаў будаўніцтва, што пяройдуць на 1933 год,—зьяўляюцца для Дзяржпляну, наркаматаў і цэнтральных установаў адной з цэнтральных і важнейшых задач.

Наркаматы і цэнтральныя гаспадарчыя арганізацыі пры прадстаўленьні пляну на 1933 г. павінны будуць пакласьць усе лічбавыя матар'ялы з тэкставай характарыстыкай па выніках выкананьня пляну бягучага году.

На кіраўніцтве народна-гаспадарчага ўліку БССР ляжыць задача—безадкладна даць мэтадалёгічныя ўказаньні гаспадарчым арганізацыям, па якіх апошнія павінны прадставіць вынікі выкананьня пляну 1932 г.

Пры складаньні народна-гаспадарчага пляну на 1933 г. трэба выходзіць з дырэктыў партыі і ўраду на складаньні 2-га пяцігадовага пляну, з апошніх пастаноў па пытаньні разгортваньня савецкага гандлю, перабудовы рэботы прамкаапэрацыі і аднаасова пры выяўленьні асноўных намётак на адна-гаспадарчага пляну на 1933 г. неабходна весьці канчатковае ўдасканаленьне і прапрацоўку папярэдніх намётак 2-й пяцігодкі.

25 жніўня г. г. СНК БССР разгледзеў папярэднія намёткі 2-й пяцігодкі прадстаўленыя Дзяржпляном. СНК БССР гэтыя намёткі як арыентыровачныя прыняў да ведама і адначасова даў Дзяржпляну, наркаматам і гаспадарчым установам рад указаньняў для далейшай і канчатковай распрацоўкі 2-га пяцігадовага пляну.

Раней чым перайсьці да характарыстыкі тых задач, якія вызначаны СНК БССР для далейшай работы па 2-й пяцігодцы, неабходна адзначыць асноўныя недахопы і недастатковасьць тэй работы, якая была праведзена як гаспадарчымі арганізацыямі, так і Дзяржпляном на першым этапе па другой пяцігодцы.

Наркаматы і Дзяржплян на першым этапе прапрацоўкі пляну 2-й пяцігодкі зусім недастаткова прапрацавалі пытаньні якаснага характару Наркаматы і установы прадставілі матар'ял у Дзяржпляне без тэкставай, эканамічнай характарыстыкі намётак 2-й пяцігодкі.

Зусім нездавальняюча як наркаматамі так і

ЗА ГРАНІЦАЙ

Кампартыя Германіі організуе адзіны фронт барацьбы з фашызмам

БЭРЛІН. 17-IX. Новы орган кампарты **«Экстраблят»** надрукаваў маніфэст ЦК Германскай кампарты да ўсіх працоўных.

«Усім вам,—гаворыцца ў маніфэсце,—надзвычайныя дэкрэты нясуць голад і галечу. Па ўсёй Германіі ўзрастае хваля масавага супраціўленьня разбойніцкаму паходу міліянэраў, капіталістаў і юнкераў. У рэйхстагу 513 галасамі супроць 42 было прынята патрабаваньне кампарты аб адмене надзвычайнага дэкрэту фон-Папена. Ад нас-жа, буржуазія ігнаруе пастанову рэйхстагу. Таварышы з прафсаюзаў, абгаварэце на вашых сходах, канфэрэнцыях актыву і фабзаўкомаў нашу прапанову аб стварэньні адзінага фронту барацьбы супроць голаду і надзвычайных дэкрэтаў».

Маніфэст спыняецца на новым эдрадзіцкім манэўры сацыял-дэмакратаў, які выявіўся ў іх прапанове аб усенародным галасаваньні па пытаньні аб адмене некалькіх пунктаў надзвычайнага дэкрэту фон - Папена. Маніфэст рашуча выказваецца супроць мерапрыемстваў ураду ў галіне ўзбраеньняў.

Германія адмаўляецца ад ўдзелу ў работах канфэрэнцыі па разбраеньні

БЭРЛІН. 17-IX. Агенцтва «Вольф» паведамляе, што германскі міністар замежных спраў Нэйрат зьвярнуўся да старшыні канфэрэнцыі па разбраеньні з лістом, у якім гаворыцца, што ўсе дзяржавы ў пытаньні аб разброеньні павінны падпарадкавацца аднолькавым правілам і нормам і ні для адчэй з дзяржаў не павінна існаваць дыскрымінацыі.

Ліст канстатуе далей, што ўсе высілкі Германіі дабіцца дыплёматычным шляхам вырашэньня пытаньня аб роўнапраўі да гэтага часу не далі здавальняючых вынікаў. Таму Германскі ўрад ня можа прыняць запрашэньня, каб удзельнічаць у сэсіі бюро канфэрэнцыі па разбраеньні, якая адкрываецца 21-га верасьня б-г.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Катаржныя прысуды над рэвалюцыйнай моладзьдзю

ВАРШАВА. 17-IX. У **Лодзінскім** акруговым судзе скончылася слуханьне справы 4-х маладых рабочых, якія абвінавачваліся ў арганізацыі дэманстрацыі, у часе якой рабочыя кідалі антыдзяржаўныя лёзунгі. Два абвінавачаных засуджаны кожны на паўтара гады турэмнага зьняволеньня, рэшта апраўдана.

Той-жа суд засудзіў 2-х маладых работніц па абвінавачваньні ў камуністычнай агітацыі сярод школьнай моладзі да 2-х год катаржнай турмы кожную.

У **Львове** скончыўся працэс 20-цігадовага селяніна, **Пётры Грыба**, які аб вінавачваўся ў арганізацыі камуністычных ячэек, распаўсюджваньні антыдзяржаўных лістовак і агітацыі сярод салдат. **Грыб** засуджаны на тры гады катаржнай турмы.

Масавыя звальненьні рабочых у Верхняй Сілезіі

ВАРШАВА. 16-IX. Масавыя звальненьні ў **Верхняй Сілезіі** рабочых каменна - вугольнай прамысловасьці працягваюцца. Дырэкцыя шахты **«Макс»** абвясьціла аб звальненьні **500** гарнякоў з першага кастрычніка б-г. На шахце «Макс» працуюць усяго 1900 рабочых. Мяркуецца таксама звальненьне большасьці служачых у шахтах Верхняй Сілезіі.

Зацятая бітва беспрацоўных з паліцыяй

ВАРШАВА. 16-IX. Беспрацоўныя з пасёлку **Бжэзіны Сылезке** (Верхняя Сілезія) ў ліку некалькі сот чалавек наладзілі налёт на мясцовага кулака і пачалі кідаць у яго дом каменьнямі. Паліцыя не магла справіцца з беспрацоўнымі, якія аказалі ёй сур'ёзнае супраціўленьне. Былі выкліканы з **Крулеўскай Гуты** конна-паліцэйскія часьці, якія зрабілі кавалерыйскую атаку на беспрацоўных, якія абаранялісь капанцамі.

Кітайскі друк аб прызнаньні Японіяй Манчжурскай дзяржавы

ШАНХАЙ. 16-IX. Кітайскі друк разглядае прызнаньне Японіяй Манчжурскай дзяржавы, як новы крок Японіі па шляху да поўнага захопу Манчжурыі, які (захоп) ажыцьцяўляецца пад шыльдаю «добравольных згодаў» паміж Манчжурскай дзяржавай і Японіяй.

Амаль усе перадавыя кітайскія газэты крытыкуюць палітыку нанкінскага ўраду, заазначаючы, што гэта палітыка, якая асноўваецца на давер'і да Лігі Нацый і на веры ў непарушнасьць міжнародных згодаў, пацярпела крах і нарабіла шкоды ўсяму Кітаю.

Газэты кпіць над жаданьнем нанкінскага ўраду абапрэцціся ў сучасны момант на дагавор 9-ці дзяржаў. Крытыкуючы гэты намер Нанкіну, газэта **«Шуньбао»** зазначае, што дагавор 9-ці дзяржаў быў заключаны «не па міласьці да Кітаю, а толькі для таго, каб падзяліць кантроль над Кітаем між дзяржавамі, якія падпісалі гэты дагавор».

Аскоўныя пункты япона-манчжурскага „эканомічнага" блёку

ТОКІЁ. 16-IX. Паводле вестак **«Джапан Таймс»** — усьлед за фармальным прызнаньнем Манчжурскай дзяржавы выявілася, што кіраўніцтва вайсковага міністэрства, міністэрства калёній, міністэрства зямляробства і міністэрства гандлю сумесна з кіраўнікамі банкаўскага сьвету выпрацавалі наступныя асноўныя прынцыпы эканамічнага блёку, які ствараецца паміж Манчжурыяй і Японіяй.

1. Гаспадарчая дзейнасьць Манчжурыі і Японіі павінна быць узгоднена;

2. японская прамысловасьць вырабляе гатовыя тавары, манчжурская прамысловасьць абмяжоўваецца выпускам сыравіны;

3. манчжурская дзяржава забясьпечвае Японію сыравінай і атрымлівае гатовыя тавары;

4. распрацоўваюцца пляны, якія па пярэджваюць выраб адпаведных тавараў у абедзьвюх краінах;

5. ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў вымагае адпаведных крокаў.

Шарль Барон аб посьпехах пяцігодкі

ГРОЗНЫ. 16-IX. У **Грозны** прыехаў старшыня французкай парляманцкай камісіі па справах горнай прамысловасьці—Шарль Барон. Супрацоўнік газэты **«Грозненский рабочий»** меў доўгую гутарку з Шарлем Баронам. За кранаючы мэту прыезду ў СССР Шарль Барон сказаў:

«Я прыехаў сюды па запрашэньні Саюзу Нафтаэкспарту, Галоўная мэта паездкі—азнаёміцца на месцы з савецкай нафтавай прамысловасьцю. Па звароце ва Францыю я зраблю даклад аб усім, што я бачыў, у горна-нафтавай камісіі палаты дэпутатаў».

Гаворачы аб сваіх уражаньнях, Шарль Барон заявіў: «Пакуль што я меў магчымасьць бачыць вельмі мала, але першыя ўражаньні ад СССР наогул і ад Грознага ў прыватнасьці надзвычайныя. У мяне стварылася думка, што **СССР хутка і рашуча ідзе па шляху прамыслова га пра грэсу**, хутка зойме належачае яму месца сярод самых перадавых краін сьвету і **без сумлеву справіцца з усімі задачамі ў галіне будаўніцтва, якія ён сабе паставіў.** Мне здаецца, што тое, «што я меў магчымасьць бачыць, ёсьць **пачатак арганізацыі сапраўднага сацыялістычнага ладу.** Я быў прыемна здзіўлены парадкам і плянавасьцю, з якімі вядзецца работа, і энтузіязмам, з якім усе імкнуцца да дасягненьня гэтай мэты».

Далей Шарль Барон сказаў: «Я бачыў пакуль што толькі Грозны. Я сам стары нафтавік і бачыў вельмі шмат ў гэтай галіне ,але ўсё, што я знайшоў тут, адпавядае апошняму слову нафтавай тэхнікі. Я бачыў прамысловасьць і заводы і адведаў навукова-дасьледчы інстытут. Маючы магчымасьць задаваць люб... пытаньні, на якія мне адказвалі вельмі ветліва, я могу сказаць, паклаўшы руку на сэрца, што **ня толькі нічаму ня мог навучыць вас, але я хацеў-бы сам шмат чаму навучыцца ад вас. Я пераканаў ся ў тым, што вы сумелі ця толькі радыкальна ліквідаваць стары лад у палітычнай галіне, але сумелі падпарадкаваць сабе нават галоўны фактар сучаснай эканомікі.**

Я-б сказаў, што нафта была ключом, якія адкрыў вароты, праз якія распачаліся палітычныя і эканамічныя адносіны паміж Францыяй і СССР. трэба памятаць, што Францыя ўжывае многа нафты, але амаль зусім яе не здабывае. Уся французкая здабыча нафты складае 2 проц. патрэбы, рэшту 98 проц. Францыя ўвозіць з-за граніцы. Я асабіста вельмі ганаруся тым, што быў адным з ініцыятараў увозу ва Францыю савецкай нафты Гэты ўвоз ня толькі стварыў фундамант для зближэньня між абодвум. краінамі. але быў эканамічна вельмі выгадны абодвым краінам.

Да гэтага часу снабжэньне Францыі нафтапрадуктамі цалкам злежала ад англа-амэрыканскіх трэстаў. Дзякуючы савецкай нафце Францыя вызвалілася ад гэтай залежасьці і цяпер расійская нафта адыгрывае першарадную ролю ў снабжэньні французкага аўтатранспарту, авіяцыі і флёту.

«Я з вялікім задаволеньнем даведаўся, што Масква ратыфікавала дагавор, заключаны гэтымі днямі ў Парыжы аб дастаўцы Францыі 2 мільёнаў тон нафты, таму што рабіў усё магчымае дзеля таго, каб спрыяць заключэньню гэтага дагавору.

«Першы пяцігадовы плян,—кажа да лей Шарль Барон,—СССР **выканае.** Тая акалічнасьць, што СССР **раней** тэрміну выканаў плян па двух асноўных энэргетычных галінах—нафце і электрыфікацыі, пераконвае мяне ў тым, што **Савецкі Саюз справіцца** са **ўсімі эканамічнымі цяжкасьцямі, якія стаяць перад ім».**

Нарэшце Шарль Барон сказаў: «Хачу скарыстаць выпадак для таго, каб адзначыць маю расчуленасьць тым зусім выключным прыёмам, які зрабілі мне ўсе савецкія арганізацыі, пачынаючы з Масквы і Ленінграду і канчаючы Грозным».

Па БССР

Аўтавоз для падвозкі лесаматар'ялаў на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце.

▲ Швэйная фэка «Сьцяг індустрыялізацыі» за першую дэкаду верасьня выканала прамфінплян на 95,7 проц.

▲ Прамфінплян швэйнай ф-кі «Кастрычнік» выкананы за першую дэкаду верасьня на 78,4 проц., а па ўтыльцэху на —107,8 проц.

▲ Юнсектар ДБВ рыхтуе да ХУ гадавіны Кастрычніка спэцыяльным выданьнем фота-мантажную кніжку для дзяцей пад назвай «15 гадавін».

▲ Жэрэйска-беларускі слоўнік выпішаў з друку. У слоўніку 12 тыс. слоў.

▲ Фабрыкай Белдзяржкіно заканчваецца зьёмка гукавога мастацкага фільму «Адраджэньне Кейтана Бэкера» па сцэнару Перац Маркіша. Тэма фільму—зварот амэрыканскага рабочага ў СССР пасьля 26-гадовага пра бываньня ў Амэрыцы і новыя мэтады работы ў СССР.

У Бабруйск выехала зьёмачная брыгада № 8 фабрыкі Белдзяржкіно для ўтварэньня натуральных эдымаў юбілейнага поўнамэтражнага абарончамастацкага фільму «Заходні фронт» па сцэнару Радзінскага на тэму: «Ператварэньне вайны імпэрыялістычнай у грамадзянскую».

▲ Галоўрэпэртакомам пакінуты на пастаноўкі гукавы фільм «Адбітак часу» па сцэнару Ціпай.

▲ Заканчваецца зьёмка мастацкага фільму «Два разы народжаны» па сцэнару Кобеца. Тэма—ліквідацыя продпаўласьніцкай псыхідэалёгіі пад уплывам сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі».

▲ Тры нацыянальных эстрадных брыгады: беларускую, жэрэйскую, і польскую арганізуе Беларускае аддзяленьне ДАМЭЦ'а ў пачатку 1933 г.

▲ У канцы верасьня культаддзел гарпрафсавету сумесна з Бел. ДАМЭЦ'ам скліча нараду загалічыкіў клюбаў і загадчыкаў культсэктароў саюзаў па пытаньні мастацкага абслугоўваньня ў дні Кастрычніцкіх сьвят.

▲ Эстрада цыркавых прадпрыемстваў аддрыгаецца ў Менску ў пачатку дзе месяцы.

▲ У пазыковую эстафэту першай уключылася Магілёўская фізкультурная арганізацыя, якая ажіраваць ў Мастоцкі сельсавет 9 брыгад.

▲ 1300 прагадзён адпрацаў калектыў фізкультурнікаў Магілёўскай шоўкавай фабрыкі на торфазаводзе «Грыбнёва».

▲ Бюро фізкультуры арганізавана пры Белсамтрамсавеце.

Па Менску

⊙ Гэтымі днямі ў Менску пачынаюцца канцэрты ўкраінскай паказальнай капэлі бандурыстаў Укрфілу. У складзе капэлі 12 бандурыстаў, на чале з мастацкім кіраўніком тав. **Кабакам.**

⊙ У рэпэртуары капэлі—клясычныя народныя, гістарычныя і сучасныя песьні кампазытараў Багуслаўскага, Лысенка, Верані́ўскага, Стэпэнка, Боркава і інш.

Пра зьмену палажэньня аб раённых зьездах саветаў і раённых выканаўчых камітэтах

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 23 верасьня 1931 г. «Пра зьмену асноўных палажэньняў аб раённых зьездах саветаў і раённых выканаўчых камітэтах» (З.З. СССР, 1931 г., № 61, арт. 396) і пастановай СНК Саюзу ССР № 764 ад 21 мая 1932 г. «Па дакладу ЦУДартрансу аб выніках работы за 1931 г. і перспэктывах на 1932 г.» (З. З СССР, 1932 г., № 39, арт. 236), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

I.

1. Арганізаваць у складзе раённых выканаўчых камітэтаў дарожныя аддзелы.

II.

2. У адпаведнасьці з гэтым запісаць арт. 32 палажэньня аб раённых зьездах саветаў і раённых выканаўчых камітэтах (З. З. БССР, 1931 г. № 15 паст. 134) і дапоўніць гэтае палажэньне арт. 32-а ў наступнай рэдакцыі:

«32. У галіне дарожнай гаспадаркі на раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) загадваньне дарожнай гаспадаркай па дарогах рэспубліканскага і раённага значэньня; будаўніцтва дарог і дарожных пабудоў раённага і сельскага значэньня; рамонт і ўтрыманьне ў парадку дарог і дарожных пабудоў рэспубліканскага, раённага і сельскага значэньня; нагляд за будаўніцтвам дарог, якія будуюцца гаспадарчымі арганізацыямі;

б) кіраваньне будаўніцтвам дарог сельскага значэньня, ужываньне захадаў да арганізацыі самадзейнасьці і правядзеньне работ у парадку працоўнага будаўніцтва і прыцягненьне насельніцтва да працоўнай гужавой павінасьці паводле чыннага заканадаўства;

в) дапамога правядзеньню дарожнага будаўніцтва на дарогах агульнадзяржаўнага значэньня і нагляд за іх становішчам;

г) складаньне сьпісаў дарог рэспубліканскага, раённага і сельскага значэньня; зацьверджаньне сьпісаў сельскіх дарог і падача ў Галоўнае Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту сьпісаў дарог рэспубліканскага і раённага значэньня, падлік дарог спэцыяльнага значэньня;

д) вядзеньне дарожнай тэхнічнай і эканамічнай статыстыкі, а таксама тэхнічнай і фінансава-матэрыяльнай справаздачнасьці па дарогах рэспубліканскага, раённага і сельскага значэньня;

е) загадваньне аўтамабільнай справай; падлік, плянаваньне і размеркаваньне аўтамабільнага транспарту; тэхнічны нагляд за яго эксплёатацыяй; арганізацыя аўтамабільнага руху; нагляд за захаваньнем правіл руху па ўсіх дарогах; нагляд за выкананьнем пляну гаражнага будаўніцтва;

32-а. У галіне камунальнай гаспадаркі і сувязі на раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) кіраваньне правядзеньнем жыллёвай палітыкі ў раёне, дапамога раўсіцьцю жыллёвай кааперацыі і нагляд за яе дзейнасьцю;

б) нагляд за выкананьнем будаўнічых правілаў;

в) арганізацыя пажарнай аховы ў раёне і нагляд за становішчам пажарнай аховы прадпрыемстваў і пабудоў, не падпрадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту; ужываньне захадаў для разьвіцьця агнятрывалага будаўніцтва;

г) распрацоўка праектаў сеткі ўстаноў сувязі ў раёне;

д) дапамога арганізацыі сувязі ў раёне; кантроль над работаю ўстаноў сувязі і ўдзел у фінансаваньні будаўніцтва сувязі».

3. Арт. арт. 43 і 44 палажэньня пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты (З. З. БССР 1932 г., № 9, арт. 37) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«43. Для непасрэднага загадваньня на тэрыторыі раёну пасобнымі галінамі кіраўніцтва, што ўваходзяць у кампетэнцыю раённага выканаўчага камітэту, раённы выканаўчы камітэт мае наступныя аддзелы: 1) агульны, 2) эканомічны, 3) фінансавы, 4) народнай асьветы), 5) дарожны, а таксама плянавую камісію і раённую рабоча-сялянскую інспэкцыю.

Апроч гэтага, пры кожным раённым выканаўчым камітэце існуе раённае кіраўніцтва рабоча-сялянскай міліцыі, інструктары па савецкім будаўніцтве і раённыя інспэктары: 1) мясцовай гаспадаркі, 2) снабжэньня, 3) заховы здароўя, 4) працы і сацыяльнага забясьпячэньня, 5) сацыяльнага забясьпячэньня, 6) вайсковых спраў і 7) фізычнай культуры».

«44. З дазволу Прэзыдыуму Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР у раёнах са значна разьвітаю мясцовай прамысловасьцю і значнай камунальнай гаспадаркаю могуць арганізоўвацца аддзелы мясцовай гаспадаркі.

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
М. Гнілякеві**ч**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Ляўкоў

Пра зацьверджаньне справаздачы аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1931 год

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Пасьпяховае выкананьне народнагаспадарчага пляну 1931 году—трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у выніку няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі па індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, зьвязаны з гэтым рост усяго народнага даходу і асабліва ўдзельнае вагі сацыялістычнага сэктару — поўнасьцю забясьпечылі выкананьне пяцігадовага пляну ў 4 гады. Дзяржаўны бюджэт БССР 1931 г. ажыўся адным з магутнейшых вагароў партыі і ўраду ў барацьбе за пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтай задачы. Дасягнутыя вынікі ў справе ствараньня цьвёрдай фінансавай базы на аснове ўкараненьня гаспадарчага разьліку і карэнный перабудовы фінансава-крэдытнай сыстэмы забясьпечылі ўзятыя тэмпы на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Разам з гэтым вынікі выкананьня дзяржаўнага бюджэту за 1931 г. выяўляюць рад буйнейшых недахопаў, асноўнымі з якіх зьяўляюцца: усё яшчэ недастаткове ўкараненьне гаспадарчага разьліку ва ўсе зьвены гаспадарчай сыстэмы; грубейшае парушэньне ў шмат якіх выпадках фінансава-крэдытнай дысцыпліны і незахаваньне рэжыму эканоміі, недастаткова рашучае правядзеньне кантролю рублём у адносінах арганізацый, якія ня выконваюць пляну накапленьняў, фінансавых абавязацельстваў і асабліва —над ходам капітальнага будаўніцтва. У выніку гэтага адзначаецца: значэнне недавыкананьне прамысловасьцю праграмы накапленьняў, што пацягнула недапаступлене плянжоў ў бюджэт і няпоўнае выкананьне пляну па датацыі мясцовым бюджэтам, перавыдаткаваньне і няправільнае скарыстаньне ў шмат якіх выпадках сродкаў па капітальным будаўніцтве, перавышэньне ў рэдзе выпадкаў ліміту на адміністрацыйна-кіруючыя выдаткі (НК Зем, б. ВСНГ, НКЛеппрам, НКСнаб, НКПрацы і інш.), зусім недастатковае зьніжэньне дэбіторскай і крэдыторскай завінавачанасьці па бюджэце (на 1 студзеня 1932 г.—5.092.368 р. па дэбіторскай і 285.956 р.—па крэдыторскай завінавачанасьці), грубае парушэньне радам наркаматаў і арганізацый дырэктыў ураду аб недапушчальнасьці стварэньня без асобнага дазволу спэцыяльных сродкаў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР асабліва адзначаюць як недапушчальнае зьявішча поўнае ігнараваньне гаспадарчага разьліку і фінансава-бюджэтнай дысцыпліны б. ВСНГ, НКЛеппромам у сэнсе значнага перавышэньня лімітаў па адміністрацыйна-кіраўнічых выдатках па цэнтральным апараце за кошт сродкаў гаспадарчых аб'яднаньняў, факты парушэньня паказанай дысцыпліны і ўтварэньня вялікай дэбіторскай запазычанасьці па Народным Камісарыяце Земляробства (уключаючы сродкі саюзнага бюджэту—5.585,4 тыс. руб.).

Выходзячы з гэтага і ўлічваючы рашаючае значэньне для ажыцьцяўленьня праграмы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва 4-га заключнага году пяцігодкі, базумоўнага выкананьня намечанай праграмы сацыялістычных накапленьняў, сапраўднага ажыцьцяўленьня гаспадарчага разьліку і рашучага ўкараненьня рэжыму эканоміі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Справаздачу аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту за 1931 г. зацьвердзіць: па даходах у суме 165.285.807 р. 36 к., па расходах у суме 165.286.731 р. 56 к. з пакрыцьцем перавышэньня выдаткоў над даходамі ў суме 924 р. 20 к. за кошт паступленьняў даходаў 1932 г.

2. Абавязаць наркаматы, цэнтральныя арганізацыі, гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты пастаўіць як адну з цэнтральных задач правядзеньня сапраўды бальшавіцкай барацьбы за рэжым эканоміі за правільнае і эфэктыўнае скарыстаньне сродкаў, ажыцьцяўшы з гэтай мэтай без адкладныя канкрэтныя мерапрыемствы, не дапушчаючы, у прыватнасьці, перавышэньня будаўнічых лімітаў, перавыдаткаваньня фондаў зарплаты і замарожваньня дзяржаўных сродкаў у нескончаным будаўніцтве.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў, Беларускай Канторы Дзяржбанку і спэцбанкам строга ўжываць практыку кантролю рублём з мэтаю забясьпечаньня выкананьня вызначаных вытворча-фінансавых планаў, выяўляючы асаблівую ўвагу на ўкараненьне гаспадарчага разьліку на будаўніцтве.

4. Адзначыць нездавальняючае скарыстаньне сродкаў па капітальным будаўніцтве, па сельскай гаспадарцы (па саўгасах не скарыстана да 1 млн. р.) у 1931 г., адсутнасьць рашучага агуду ў гэтых адносінах у 1-м паўгодзьдзі 1932 г., недастатковасьць нагляду за ходам будаўніцтва і правільным скарыстаньнем сродкаў з боку Народнага Камісарыяту Земляробства, а таксама поўную неўпарадкаванасьць учоту ў выніках гаспадарчай дзейнасьці па саўгаснай сыстэме.

Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па вышчэньні гэтых недахопаў і аб ужытых мерах у двухдэкадны тэрмін паведаміць НК БССР.

5. Адзначаючы слабае скарыстаньне крэдытаў па капітальным будаўніцтве па кадрах (82,8 проц.), а таксама па падрыхтоўцы кадраў для сельскай гаспадаркі (76,9 проц.), недазволеньне пасобнымі ведамствамі пляну прыёму кантынгентаў (дашкольных тэхнікумы, пэдагагічныя курсы і інш.), наяўнасьць значнага адсеву кантынгентаў (па ВУЗ'ах і ВТУЗ'ах—14,4 проц., тэхнікумах—14,3 проц., рабфаках—15,5 проц.), прапанаваць наркамам, шляхам правядзеньня належнай падрыхтоўкі і выкананьня намечанага будаўніцтва, асабліва інтэрнатаў, забясьпечыць поўнае выкананьне зацьверджанага пляну асеньняга прыёму кантынгентаў.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, пад адказнасьць тав. **Рачыцкага**, Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці, пад адказнасьць т. **Грысевіча** і ўсе іншыя наркаматы і ўстановы, пад адказнасьць іх кіраўнікоў, ні ў якім разе не дапушчаць перавышэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў звыш зацьверджаных каштарысаў, безадкладна спыніць аплату гэтых выдаткаў за кошт сродкаў аб'яднаньняў і прадпрыемстваў, спэцыяльных фондаў і іншых на прызначаных на гэтую мэту сум.

7. Даручыць НК РСІ і Праскурору Рэспублікі ўзмацніць барацьбу з бесгаспадарчасьцю, незаконным скарыстаньнем дзяржаўных сродкаў, фактамі парушэньня фінансава-бюджэтнай дысцыпліны.

Абавязаць НК РСІ у тэрміновым парадку разглядзець усе выяўленыя факты парушэньня фінансава-бюджэтнай дысцыпліны, з прыцягненьнем вінаватых у разбазараньні народных сродкаў да жорсткай адказнасьці.

8. Адзначаючы невыкананьне радам наркаматаў і цэнтральных арганізацый пастановы ўраду аб спэцсродках, катэгарычна забараніць усім наркаматам і арганізацыям стварэньне спэцыяльных сум за кошт якіх-бы тамі ні было сродкаў без дазволу Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР.

9. Адзначаючы адсутнасьць нагляду за пошным паступлеьнем 4 процантных адлічэньняў на падрыхтоўку кадраў па прамысловасьці, а таксама за правільным скарыстаньнем гэтых сум, прапанаваць Дзяржпляну і Народнаму Камісарыяту Фінансаў разам з зацікаўленымі ведамствамі прапрацаваць пытаньне аб парадку скарыстаньня сродкаў па 4-процантных адлічэньнях на зарплату ў напрамку канцэнтрацыі гэтых сум і ўстаноўленьня сапраўднага кантролю за іх скарыстаньнем.

10. Гэту пастанову ўнесьці на зацьверджаньне чарговай сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Выканаўчы аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякеві**ч.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Ляўкоў.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР

пра ослабаненьне тав. Брыгневіча Г. М. ад абавязкаў намесьніка Наркома Асьветы БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР *пастанаўляе:*

У сувязі з пераходам тав. *Брыгневіча*, Георгія Мініча, на іншую работу *ослабаніць* яго ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Асьветы БССР.

Выканаўчы аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР

пра назначэньне тав. Рудніцкага В. Р. намесьнікам Наркома Асьветы БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР *пастанаўляе:*

Назначыць тав. *Рудніцкага* Васіля Рыгоравіча, Намесьнікам Народнага Камісара Асьветы БССР.

Выканаўчы аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Аб перарэгістрацыі зброі, якая знаходзіцца ў карыстаньні розных (не вайсковых) устаноў, прадпрыемстваў і ў паасобных асоб

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

У мэтах ўпарадкаваньня ўліку зброі і выдачы дазволаў на хаваньне гэтакай у розных установах і прадпрыемствах для мэт аховы, а таксама дазволаў на права нашэньня і хаваньня зброі паасобнымі грамадзянамі, якім неабходна гэтакая ў сувязі з характарам іх работы, Савет Народных Камісараў **пастанаўляе:**

1. У пэрыяд з 13-га верасьня па 13-е кастрычніка 1932 г. вытварыць па БССР пераўлік усёй зброі (незалежна ад сыстэм), якая знаходзіцца ў карыстаньні ў прадпрыемствах, установах і ў паасобных грамадзян, з наступовай выдачай дазволаў на права хаваньня гэтакай.

2. Пераўлік і выдачу дазволаў ускласьці на органы АДПУ.

3. Прадпрыемствы, установы і паасобныя грамадзяне для перарэгістрацыі зброі павінны зьявіцца ў бліжэйшы орган АДПУ ў паказаны ў п. 1 тэрмін.

4. Асобы, якія ўхіляцца ад перарэгістрацыі зброі, падлягаюць прыцягненьню да адказнасьці па арт. 145 КК, як за незаконнае хаваньне зброі.

5. Гэтая пастанова ўваходзіць у мо з дня апублікаваньня ў друку.

Старшыня СНК БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік Справаў СНК і ЭКАСА
КАНДЫБОВІЧ.

ПАПРАЎКА

У № 206 ад 17 верасьня зьмешчана тэлеграма аб выкананьні Лепельскім раёнам пляну збожжазагатовак на 60,8 проц. Рэдакцыя была няправільна інфармавана з прычыны блытаніны ў тэлеграме. Раён выканаў плян на 68,8 проц.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
Да ХУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выдае альбом
„БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ"
у альбоме, у мастацкіх фота адлюстравана сацыялістычнае будаўніцтва у прамысловасьці, сельскай гаспадарцы і культуры БССР, усяго звыш 250 малюнкаў з паясьняльнымі тэкстамі на беларускай і нямецкай мовах
Альбом „Беларусь Савецкая" надрукован на высокаякаснай паперы, спосабам мэцоцынто па тыпу „СССР на стройке" у калянкоравай аправе з цісьненьнем.
Тыраж альбому абмежаваны і прадавацца ёй будзе толькі па папярэдніх аплочаных заказах
ЦАНА АЛЬБОМУ ПА ПАДПІСЦЫ 25 РУБ.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА УСІМІ КНІГАРНЯМІ І ФІЛІЯЛАМІ БДВ.
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДВБ.

ДАВЕДАЧНА-ІНФОРМАЦЫЙНАЯ КАНТОРА ПРЫМАЕ АБВЕСТКІ
ва ўсе цэнтральныя газэты гор. Масквы і іншых рэспублік
Адрас: Менск, Ленінская, 28,
тэл. 17-70

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня
Ад 13 верасьня мастацкі фільм КУЛЬГАВЫ ПАН
З выш програмы кіно-хроніка Саюзкіно

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гада.
Ад 18 верасьня савецкі мастацкі фільм СУПРАЦІЎНІЦЫ
З выш програмы кіно-хроніка Саюзкіно

Згубленую візу, выд. 15 пагранатрадам гр. Перапёлка І. І. на права жыхарства на ст. Радашковічы. лічыць страціўшай моц

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА АБ АСЬПІРАНТАХ
Беларуская Акадэмія Навук, Дзяржплян і НКАсьветы склікаюць нараду дыктароў навукова-дасьледчых і вышэйшых навучальных устаноў БССР, якія маюць асьпірантуру,
або намячаюць мець асьпірантуру ў 1933 годзе
Нарада адбудзецца ў БАН а 10 гадзіне раніцы 21-га верасьня г г
ЯУКА АБАВЯЗКОВА
Парадак пытаньняў на нарадзе высланы.
Першы Віцэ-Прэзыдэнт БАН ДОМБАЛЬ
Нач. сэктару культуры і навукі Дзяржпляну БССР БУРСЕВІЧ.

Бялынкаўскі палітасьветтэхнікум
АБВЯШЧАЕ
асеньні набор студэнтаў
на 1-шы курс у колькасьці 80 чал.
На тэхнікум без іспытаў прымаюцца скончыўшыя самігодкі, рабфакі, падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікумы і саўгасвучы, рэшта падлягае іспытам.
Заявы прымаюцца да 28-га верасьня г. г.
Пачатак заняткаў з 1-га кастрычніка. Для паступленьня ў тэхнікум неабходны дакументы згодна даведніка НКА аб паступленьні у вышэйшыя навучальныя установы і тэхнікумы
Перавага пры паступленьні аддаецца членам КП(б)Б і ЛКСМБ, якія маюць камандыроўкі ад РК
Усе студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй. Узрост паступаючых ад 15 да 35 год. Тэрмін навучаньня—3 гады.
Заявы накіроўваць па адрасе: ст. Бялынкавічы, Касьцюковіцкі раён прыймовай камісіі.
В. а. дырэктара ЧЭРНЯК.

Уміўчаваж. Галоўлітбелу № А-53.

Друкарня імя Сталіна.